

ДЗЯЎЧАТЫ ІДУЦЬ НА ВЫШУК

5

ХТО ЯНА – ЖАНЧЫНА ГОДА?

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СЕРАДА № 192 (29561)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Становішча цяпер досыць складанае, але прагназуемае. Складанасць у тым, што высокі ўзровень захваральнасці трымаецца досыць доўгі час. Безумоўна, ён суправаджаецца ростам шпіталізацыі па ўсіх рэгіёнах. Вакцынацыя вядзе да адной выразнай мэты: яна засцерагае ад цяжкага цячэння захворвання. Напрыклад, у Магілёве ў рэанімацыі толькі адна прышчэпленая пацыентка, і яна ўжо ідзе на папраўку. Як паказваюць сусветныя даныя, пасля вакцынацыі рызыка шпіталізацыі памяншаецца ад 22 да 29 разоў. Прычынай развіцця чацвёртай хвалі стала распаўсюджванне ковіду сярод дзяцей і падлеткаў. Мы ўвялі ў школах, ВНУ і ССНУ больш жорсткі эпідрэжым, гэта павінна дапамагчы. Заклікаю да больш жорсткага рэагавання на парушэнне мер сацыяльнага дыстанцыявання».*

# Салодкае прадчуванне




**Кандытарскія прадпрыемствы краіны пачалі фасаваць навагоднія падарункі. Значная іх частка, дарэчы, будзе ўкамплектавана сімвалам Новага 2022 года — плюшавым тыграм.**

***На здымку:*** **маркетолаг гомельскай фабрыкі «Спартак» Наста КАВАЛЁВА рыхтуе падарункавыя навагоднія мяхі для прапановы спажыўцам.**

**Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БелТА.**

## КОРАТКА

- **У вёсцы пад Пінскам увялі каранцін з-за шалёнай лісы.**
- Беларускі куток адкрыўся ў гістарычным цэнтры Анкары.
- **Паляпшэнне якасці даставак, лічбавізацыя працэсаў — «Белпошта» прыняла новую стратэгію развіцця.**
- Гістарычныя гульні, рэканструкцыя, майстар-класы чакаюць гасцей «Вераснёвай палітры» ў Наваполацку.
- **Гомельскі маладзёжны тэатр прыедзе з гастролямі ў Віцебск.**



Па сутнасці справы

# ЗМЕНЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ І ЎЛАСНІКАЎ КВАТЭР

**Міністэрствам фінансаў нашай краіны сумесна з зацікаўленымі ведамствамі падрыхтаваны законапраект аб унясенні ў Падатковы кодэкс некаторых змяненняў на 2022 год**



**Ён прадугледжвае як новаўвядзенні па традыцыйных кірунках, так і змены канцэптуальнага характару, якія датычацца падаткаабкладання прадпрымальніцкай дзейнасці. Сярод традыцыйных кірункаў — індэксацыя ставак падаткаў, усіх сацыяльных падатковых вылікаў у мэтах адаптацыі іх да інфляцыйных працэсаў. Першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО падрабязна патлумачыў усе самыя актуальныя пытанні гэтага важнага для краіны дакумента.**

СТАР. 4

Напярэдадні падзеі

# ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ СФЕРА КРАІНЫ ПАВЫШАЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

**З 12 да 15 кастрычніка ў Мінску пройдзе XXV Беларускі энергетычны і экалагічны форум Energy Expo — 2021, удзел у якім возьме каля 200 арганізацый з сямі краін. Гэта вядучыя прадпрыемствы энергетычнай галіны і прамысловасці Беларусі, а таксама вядомыя сусветныя брэнды.**




СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

21192

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Без дысцыпліны нікуды. Таму адсюль мае жорсткія патрабаванні»

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў сёння нараду аб ходзе сельскагаспадарчых работ у краіне

**Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што больш як тыдзень таму даручаў ураду сумесна з аблвыканкамамі актывізаваць работу ў аграпрамысловым комплексе і перш за ўсё павялічыць тэмпы сяўбы азімых. «Гэта пытанне нумар адзін. Яго адкладваць нельга, таму што азімыя позна сеяць нельга — яны проста загінуць. Я прасіў працаваць не проста светлавы дзень, але там, дзе гэта магчыма, — ноччу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт адзначыў, што з-за неспрыяльных умоў надвор'я запаволіліся тэмпы ўборкі іншых сельскагаспадарчых культур. «Дзесяць дзён таму мы мелі ўсяго толькі палову, а то і менш, работ, якія трэба выканаць восенню, — канстатаваў ён. — ***Акрамя азімай сяўбы, трэба яшчэ апрацаваць глебу і перш за ўсё ўзараць. Гэта самы цяжкі від работы ў сельскай гаспадарцы на палях***».

Таксама неабходна якасна ўбраць кукурузу, у першую чаргу на зерне, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. Гэта дасць магчымасць кампенсаваць дэфіцыт збожжавых. Прадаўжаюцца работы і па ўборцы яравога рапсу. «Гэта таксама зерне і корм пасля таго, як мы атрымаем алей», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта значыць, работ непачаты край. Я яшчэ не сказаў пра бульбу, цукровыя буракі, пладовыя, ягаднікі і гэтак далей. Таму была аб'яўлена, можна сказаць, трывога. І я хацеў бы сёння пачуць даклады аб канкрэтных выніках праведзенай работы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, што тармозіць завяршэнне работ па асенняй сяўбе і нарыхтоўцы сілосных кармоў, якія пытанні засталіся нявырашаныя, што яшчэ дадаткова патрэбна аграрыям.

«Размова аб завяршэнні сяўбы не ідзе. Я спадзяюся, што да канца дня ў вас будзе 90 працэнтаў і тыя хвасты, якія ў вас застануцца, вы ліквідуеце на працягу аднаго-двух дзён. Але далей цягнуць з азімай сяўбой нельга, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***Яшчэ раз хачу папярэдзіць аграрыяў і перш за ўсё губернатараў: наперадзе вашы справаздачы па падзяжы, захаванасці жывёл. Гэта ўжо пытанне генеральнага пракурора. Не думайце, што пра гэта забыта. Мы не можам дзясяткі тысяч галоў губіць штогод, таму што гэта грошы***».

Акрамя таго, звярнуў увагу Прэзідэнт, наперадзе зімовы перыяд, нельга адкладваць неабходныя работы на потым.

«Вельмі прашу захоўваць тэхналагічную дысцыпліну. І наогул без дысцыпліны нікуды. Таму адсюль мае жорсткія патрабаванні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама выказаўся аб перабоях з пастаўкамі цукру ў магазіны.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што нядаўна з'явіліся паведамленні аб перабоях з пастаўкамі цукру ў магазіны. Гэтай інфармацыі Прэзідэнт здзівіўся. «З чаго раптам?» Запасы на складах велізарныя, і перапрацоўку пачалі. І раптам нешта там абвалілася. Глядзіце, мужыкі, яшчэ раз абваліцца — гэты абвал будзе ад гандлёвых сетак да ўрада», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

«Я разумею, калі нейкае няшчасце і чагосьці не хапае. Бачыце, «не паспелі завезці, лагістыка падвяла». Гэта што, у Вялікабрытаніі? Дзе кіроўцаў не хапае, каб паліва завезці на запраўку. Дык я не Джонсан (прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан. — **Заўв. рэд.**), я ж ведаю, адкуль ногі растуць. Таму глядзіце, каб у нас ні па цэнаўтварэнні, ні па пастаўках у магазіны для насельніцтва не было перабояў з таварамі», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама падчас нарады кіраўнік дзяржавы прапанаваў замацаваць яблыневыя сады за ўніверсітэтамі і школамі.

«У нас школьнікі ўжо нават у вёсцы не ведаюць, што такое зямля, глеба. Яны ўжо не ўмеюць працаваць. А раней у кожнага былі падсобныя гаспадаркі, у кожнай школе. І дзеці нарыхтоўвалі сабе на ўсю зіму да наступнага ўраджаю і моркву, і буракі, і капусту — тое, што трэба да стала», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

***За ўніверсітэтамі і школамі маглі б быць замацаваны сады з пладовымі культурамі, сказаў кіраўнік дзяржавы. «Гектараў 15–20***. І яны ўбяруць гэта. Мы забудзем, што такое польскі яблык: сваіх яблыкаў будзе дастаткова. Элементарна, здаецца, але не робім», — канстатаваў Прэзідэнт.

### У тэму

**Аляксандр СУБОЦІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

«Сёлета ўрад захаваў аб'ёмы льготнага крэдытавання для арганізацый аграпрамысловага комплексу, дадаткова былі выдзелены крэдыты для закупкі збожжа. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту прафінансавана закупка 50 збожжаўборачных і 50 кормаўборачных камбайнаў. Усяго прадпрыемствы закупілі сёлета 460 камбайнаў, больш за 650 трактароў і 2,5 тысячы адзінак іншай тэхнікі.

Выдаткі кансалідаванага бюджэту на АПК у гэтым годзе склалі больш як Br2 млрд з ростам у 1,4 раза ў параўнанні з 2020 годам».

# ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ СФЕРА КРАІНЫ ПАВЫШАЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*





Па словах **намесніка міністра энергетыкі Вольгі ПРУДНІКАВАЙ**, сёлета беларуская энергасістэма адзначае сваё 90-годдзе, таму гэты юбілейны форум будзе праведзены годна, каб ён быў цікавы для ўсіх удзельнікаў. «У час мерапрыемства мы абмяркуем стратэгічныя напрамкі развіцця энергетычнай сферы, важныя для жыхароў нашай краіны», — сказала Вольга Пруднікава.

Удзельнікі разгледзяць эканамічныя і экалагічныя аспекты ядзернай энергетыкі, перспектывы «зялёнай» эканомікі, павышэнне энергаэфектыўнасці і энергазберажэнне, магчымасці развіцця ў краіне электратранспарту. Размова таксама пойдзе пра лічбавізацыю паліўна-энергетычнага, вытворчага і нафтахімічнага комплексаў. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы інжынерных кадраў для паліўна-энергетычнай і іншых галін. У дні форуму пройдуць канферэнцыі, семінары, круглыя сталы, на якіх будуць прадстаўлены сучасныя тэхналагічныя рашэнні ў энергетыцы, нафтахіміі, энергазберажэнні і экалогіі.

«У паліўна-энергетычным балансе Беларусі адбываюцца істотныя змяненні ў сувязі з уводам у эксплуатацыю першага энергаблока БелАЭС. Гэта змяненні структуры вытворчасці электраэнергіі на нашых крыніцах, а таксама структуры спажывання. Электраэнергія прыходзіць як першасны носьбіт для мэт ацяплення, гарачага водазабеспячэння. Працягвае развівацца электратранспарт, грамадскі, асабісты, а таксама каршэрынгі (самакаты, ровары). Гэта патрабуе ад нас развіцця інфраструктуры, нарматыўна-прававога рэгулявання, вырашэння пытанняў тарыфнай палітыкі», — адзначыла намеснік міністра энергетыкі.



Мінпрыроды традыцыйна ўдзельнічае ў форуме, і гэты год не стаў выключэннем. Паводле **слоў намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандра ГАРОШКІ**, на калектыўнай экспазіцыі Мінпрыроды ключавымі стануць прэзентацыі тэхналогій у галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання, аднаўляльнай энергетыкі, абыходжання з адходамі. Таксама міністэрства сёлета арганізоўвае навукова-практычную канферэнцыю на тэму «зялёнай» эканомікі. «Форум стане ўнікальнай пляцоўкай для дыскусіі па пытаннях удасканалення экалагічнай палітыкі», — падкрэсліў ён.



**Намеснік дырэктара Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Леанід ПАЛЯШЧУК** дадаў: у час форуму пройдзе круглы стол на тэму павышэння энергаэфектыўнасці і комплекснага выкарыстання электраэнергіі для жыццезабеспячэння шматкватэрных жылых дамоў. «Рэалізацыя Указа нумар 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў» пачалася даволі паспяхова, ідзе цеплавая мадэрнізацыя», — адзначыў ён.

Праграма форуму ўключае міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра», Oil&Gas Technologies, «Атамэкспа-Беларусь», «Экспа-Святло», «Водныя і паветраныя тэхналогіі», «ЭкспаГорад» і XXV Беларускі энергетычны і экалагічны форум.

У дні мерапрыемства пройдзе конкурс інавацыйных і стартап-праектаў Belarus Energy Award — 2021, будуць падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу «Лідар энергаэфектыўнасці — 2021».

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ААН: дзясяткі мільёнаў людзей у 43 краінах свету знаходзяцца на мяжы галоднай смерці

**У Арганізацыі Аб'яднаных Нацый заявілі, што больш за 41 млн чалавек у 43 краінах свету знаходзіцца на мяжы галоднай смерці. Без тэрміновых мер гэтыя людзі загінуць, а колькасць галадаючых у свеце будзе толькі расці, паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН.**

«Колькасць людзей, якія могуць апынуцца на шляху да галоднай смерці, павялічылася са 135 млн да 270 мільёнаў — гэта вельмі сур'ёзная сітуацыя, якая стварае мноства праблем ва ўсім свеце. Прыкладна 41 млн чалавек у 43 краінах ужо знаходзіцца на чацвёртай стадыі вострага недахопу харчавання», — заявіў кіраўнік Сусветнай харчовай праграмы Дэвід Біслі.

Ва ўмовах голаду ў Эфіопіі, на Мадагаскары, у Паўднёвым Судане і Емене цяпер жывуць 584 тысячы чалавек. У пераважнай большасці церпяць жанчыны і дзеці. Паведамляецца, што катастрафічная сітуацыя таксама склалася ў Афганістане, Венесуэле, Гаіці, Гандурасе, Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, Зімбабвэ, Цэнтральна-Афрыканскай Рэспубліцы, Сірыі, Судане і Угандзе.

Эксперты назвалі цяперашнюю сітуацыю з голадам у свеце самай цяжкай за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў. Яны асцерагаюцца, што ў хуткім часе ў многіх краінах свету сітуацыя з харчаваннем будзе толькі пагаршацца.

Такая тэндэнцыя, на думку экспертаў, абумоўлена спалучэннем некалькіх фактараў: пандэмія COVID-19, канфлікты, экстрэмальныя пагодныя з'явы, цяжкасці з доступам да людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, а таксама рост сусветных цэн на прадукты харчавання.

### Першы ў свеце «кіназкіпаж» дасягнуў калязямной арбіты

**Расійскі касмічны карабель «Саюз МС-19» са здымачнай групай фільма «Выклік» выйшаў на арбіту, перадае РІА Навіны.**



У «Саюзе» ляцяць касманаўт Антон Шкаплераў, актрыса Юлія Перасільд і рэжысёр Клім Шыпенка. «Кіназкіпаж» адправіўся на МКС дзеля фільма «Выклік», які стане першай карцінай у гісторыі кінематографа са здымкамі прафесійных акцёраў у космасе.

Таксама ўпершыню ў гісторыі карабель «Саюз» да МКС пілатуе адзін камандзір без дапамогі прафесійнага бортінжынера.

Чакаецца, што «кіназкіпаж» прыстане да модуля «Світанне» расійскага сегмента МКС. Пасля адкрыцця люкаў каманда пяройдзе на борт станцы. На МКС Перасільд і Шыпенка правядуць 12 дзён. Іх пасадка ў казахстанскім стэпе запланаваная на 17 кастрычніка.

### Талібы ліквідавалі баевікоў ІД каля расійскага пасольства ў Кабуле

**Талібы забілі тэрарыстаў «Ісламскай дзяржавы» каля расійскага пасольства ў Кабуле, паведаміла РІА Навіны.**

«Бой паміж тэрарыстамі ІД і талібамі завязаўся ў сотні метраў ад пасольства. Ліквідавана група з пяці баевікоў», — піша агенцтва.

Па словах карэспандэнта РІА Навіны, які знаходзіўся ў пасольстве ў панядзелак, 4 кастрычніка, з будынка былі чуваць гукі страляніны. Перастрэлка вялася, як мяркуецца, з выкарыстаннем кулямётаў і аўтаматаў.

Раней «Талібан» у афганскім горадзе Джалалабад пакараў смерцю двух тэрарыстаў ІД праз павешанне. Адзначаецца, што знішчэнне баевікоў стала рэакцыяй на серыю выбухаў у Джалалабадзе.

# Як будуць фарміравацца цэны на лекі

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 5 кастрычніка падпісаў Указ № 383, паводле якога ўносяцца змены ва Указ «Аб фарміраванні цэн на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння і медыцынскую тэхніку» ад 11 жніўня 2005 года № 366, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Для павелічэння аб'ёмаў продажаў многія вытворцы даюць аптэчным сеткам фінансавыя і таварныя зніжкі, памер якіх у цяперашні час не ўлічваецца пры фарміраванні цаны. Пасля таго як змяненні набудуць моц, аптовыя і гандлёвыя надбаўкі будуць прымяняцца да адпускных цэн арганізацый-вытворцаў (кантрактных цэн імпарцёраў), паменшаных на велічыню такіх зніжак.

Акрамя таго, для забеспячэння адзіных падыходаў да цэнаўтварэння недзяржаўным аптэчным сеткам па аналогіі з дзяржаўнымі дадзена права падсумаваць аптовую і гандлёвую надбаўкі пры фарміраванні рознічных цэн.

100 БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ЮБІЛЕЙНЫ ГОД ВЫХОДЗІЦЬ НА ФІНІШНУЮ ПРАМУЮ

**«Давайце разглядаць наш стагадовы юбілей не як фінальную кропку, а як прамежкавы рубеж, пасля якога распачнецца наступнае стагоддзе і, спадзяюся, інфармацыйных падстаў для нашых сустрэч не стане менш», — прапанаваў журналістам рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ.**

Учора журналісты рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі за папулярызацыю дзейнасці БДУ ў сувязі са 100-годдзем з дня заснавання ўніверсітэта. У ліку ўзнагароджаных — і калектыў Выдавецкага дома «Звязда», а таксама рэдактар аддзела адукацыі газеты «Звязда» Надзея Нікалаева. Сярод адзначаных — і калектывы БелТА, Выдавецкага дома «Беларусь сегодня», Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне», ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» і іншыя.

Андрэй Кароль расказаў журналістам пра апошнія падзеі ва ўніверсітэце, які праз лічаныя дні адзначыць сваё стагоддзе: «Мы зацвердзілі на геральдычным савеце і ўжо зрабілі спецыяльны нагрудны знак «100 гадоў БДУ». Ён будзе ўручацца ў выглядзе памятнага медаля тым, хто прапрацаваў ва ўніверсітэце не менш як 25 гадоў, а таксама за асаблівыя заслугі перад універсітэтам».



Узнагароду ад БДУ атрымлівае Надзея НІКАЛАЕВА.

Выпушчана памятная манета, прымеркаваная да 100-годдзя. Дарэчы, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — адзіная ВНУ ў сучаснай гісторыі, якая ўдастоена права валодання памятнай манетай.

Наперадзе — два знакавыя студэнцкія мерапрыемствы. Адно з іх — афіцыйнае адкрыццё ўнутранага ўніверсітэцкага дворыка (паміж вуліцамі Бабруйская, Ленінградская і праспектам Незалежнасці), які зведаў сур'ёзную рэстаўрацыю і капітальны рамонт. Дарэчы, ужо завяршаецца другая чарга капітальнага рамонту галоўнага корпуса БДУ.

Наперадзе — мадэрнізацыя гістарычнага «будынка нумар адзін» на Чырвонаармейскай вуліцы, адкуль і пачынаўся БДУ: у першыя гады існавання ў ім размяшчалася кіраўніцтва, некаторы час там жыў і працаваў першы рэктар Уладзімір Пічэта. Цяпер у знакавым будынку размяшчаецца гістарычны факультэт універсітэта. «А 30 кастрычніка ў Палацы спорту студэнтаў чакае сюрпрыз», — паабяцаў прысутным Андрэй Кароль.

**Надзея РАСОЛЬКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## МІЖНАРОДНАЯ НУМІЗМАТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў МІНСКУ

**Нацыянальны банк краіны гэтымі днямі праводзіць X Міжнародную нумізматычную канферэнцыю. Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка, сёлета мерапрыемства прымеркавана да 25-годдзя беларускай памятнай манеты і праходзіць у анлайн-фармаце.**

У канферэнцыі прымаюць удзел прадстаўнікі беларускіх і замежных музеяў, профільных вытворчых прадпрыемстваў, вядучыя навукоўцы-нумізматы, даследчыкі гісторыі грашовага абароту, банкаўскай справы і сучаснай манетнай чаканкі.

У ходзе пленарнага пасяджэння і на тэматычных секцыях канферэнцыі будуць прадстаўлены даклады, якія ахопліваюць шырокае кола пытанняў, уключаючы грашовы абарот на тэрыторыі Беларусі ў розныя перыяды, узаемадзеянне грашовых сістэм, фарміраванне нумізматычных калекцый і музейных збораў, гісторыю банкаўскай дзейнасці, а таксама фінансавых устаноў на беларускіх землях.

Міжнародная нумізматычная канферэнцыя праводзіцца Нацыянальным банкам пры садзейнічанні Беларускага нумізматычнага таварыства з 2003 года і з'яўляецца значнай падзеяй у нумізматычным руху Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

## ПАДРОБКА НЕ ЎДАЛАСЯ

### У жанчыны выявілі фальшывае пасведчанне аб інваліднасці

**Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі спынілі аўтамабіль на адной з вуліц Гродна. Пакуль яны размаўлялі з кіроўцам, пасажырка пачала скандаліць. Жанчыну, якая адмаўлялася супакоіцца, даставілі ў райаддзел міліцыі.**

Пры праверцы дакументаў супрацоўнікі міліцыі звярнулі ўвагу на пасведчанне інваліда. Яго сапраўднасць выклікала сумненне. Таму дакумент адправілі на судовую тэхнічную экспертызу, расказала **афіцыйны прадстаўнік упраўлення ДКСЭ па Гродзенскай вобласці Алена МІСЮКЕВІЧ**.

Згодна з заключэннем эксперта, пасведчанне інваліда зроблена прадпрыемствам, якое такую вытворчасць ажыццяўляе. Гэта значыць, што сам дакумент сапраўдны, але ў ім замянілі фотаздымак. Аказалася, што раней дакумент належаў бабулі затрыманай жанчыны, яна была інвалідам другой групы. Тры гады таму бабуля памерла, а ў мінулым годзе ўнучка замест фота бабулі прыклеіла сваё, частку пячаткі дамалявала ўручную. Цяпер па дадзеным факце вядзецца праверка.

Па словах Алены Місюкевіч, на экспертызу нярэдка трапляюць падробленыя дакументы. Часцей за ўсё гэта медыцынскія даведкі, рэцэптурныя бланкі, пасведчанні кіроўцаў, пасведчанні аб рэгістрацыі транспартных сродкаў, камандзіровачныя. Як правіла, падробкі робіцца на сапраўдных дакументах, у якія ўносіцца змяненні. Напрыклад, змываюць літары і лічбы ці замазваюць, а на іх месца ўносяць іншыя альбо замяняюць фотаздымкі. Але трэба памятаць, што ўсе падробкі можна выявіць дзякуючы сучаснаму тэхнічнаму абсталяванню. А вось за выраб, выкарыстанне альбо збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак і бланкаў прадугледжана прававая адказнасць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## У КРАІНЕ СТАРТАВАЎ «АРСЕНАЛ»

**З 4 да 8 кастрычніка праваахоўнікі правядуць комплекс мерапрыемстваў па папярэджанні і спыненні правапарушэнняў у сферы абароту зброі і боепрыпасаў.**

Як паведамляе МУС, міліцыянеры будуць правяраць умовы захоўвання грамадзянамі зарэгістраванай зброі, а таксама выяўляць уладальнікаў нелегальных арсеналаў.

Асноўная мэта мерапрыемства — прафілактычная работа з уладальнікамі зброі з нагоды захавання правілаў яго выкарыстання і захоўвання, мер бяспекі, а таксама інфармаванне насельніцтва аб добраахвотнай здачы зброі, якая захоўваецца незаконна.

За восем месяцаў гэтага года з абароту канфіскавана звыш 500 адзінак незарэгістраванай зброі і амаль 35 тысяч боепрыпасаў рознага калібру. Добраахвотна здадзена каля 300 адзінак нелегальнай зброі і каля 11,8 тысячы боепрыпасаў. За розныя парушэнні ў індывідуальных уладальнікаў канфіскавана больш як 1,3 тысячы адзінак зарэгістраванай зброі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рэзананс

# ЗОНА АДКАЗНАСЦІ

**«Комсомольская правда в Беларуси» з'яўляецца беларускім СМІ, паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі. «У сувязі з узнікаючымі запытамі Міністэрства інфармацыі паведамляе, што «Комсомольская правда в Беларуси» з'яўляецца беларускім сродкам масавай інфармацыі (пасведчанне аб рэгістрацыі СМІ ад 05.06.2009 нумар 463), заснавальнікам якога выступае рэзідэнт Рэспублікі Беларусь ЗАТ «БелКП-ПРЭС», — адзначылі БелТА ў ведамстве.**

Напярэдадні старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў заявіў, што надзвычай вострая рэакцыя расійскіх калег на затрыманне беларускага журналіста «Комсомольской правды» Генадзя Мажэйкі выклікае неўразуменне. «Пэўнае неўразуменне выклікала надзвычай вострая рэакцыя нашых калег у Расійскай Федэрацыі. Да нядаўняга часу гэты абсалютна легальны сродак масавай інфармацыі, які на законных падставах дзейнічае ў Беларусі, выконвае законы Беларусі. Так, ён мае франшызу расійскага выдавецкага дома «Камсамольская праўда», але юрыдычна і фактычна гэта беларускі сродак масавай інфармацыі. Таму ў нашай кампетэнцыі, у нашай зоне адказнасці абараняць і гэтага журналіста, і гэтую рэдакцыю», — сказаў Андрэй Крывашэеў.

Ён дадаў, што рэдакцыйная палітыка «КП в Беларуси» сапраўды неаднаразова станавілася прадметам абмеркавання і даволі гарачых дыскусій у прафесійнай журналісцкай супольнасці, у тым ліку з удзелам Уладзіміра Сунгоркіна, галоўнага рэдактара ВД «Камсамольская праўда». У ходзе дыскусій ён неаднаразова падкрэсліваў незалежнасць рэдакцыйнай палітыкі «КП в Беларуси» ад Масквы і статус «Комсомольской правды в Беларуси» як беларускага СМІ. «У сувязі з гэтым вострая рэакцыя Уладзіміра Мікалаевіча на паведамленне аб затрыманні Генадзя Мажэйкі і яго эмацыянальны каментарый таксама выклікаюць пэўнае неўразуменне», — лічыць Андрэй Крывашэеў.

Часам лепш вытрымаць паўзу, чым рабіць паспешныя заявы ў адрас саюзніка. Так у сваім Telegram-канале пракаментаваў рэакцыю ў Расіі на затрыманне беларускага журналіста «Комсомольской правды» Генадзя Мажэйкі палітолаг Аляксей Дзермант. «Высвятляецца, што журналіста ніхто ў Маскве не выкрадаў, ён быў унесены ў агульнасаюзны спіс невыязных, прычым задоўга да кастрычніка гэтага года, прычым расійскім бокам. Гэта значыць, пытанні па ім былі, — адзначыў эксперт. — Праз аэрапорт ён спрабаваў пакінуць тэрыторыю Саюзнай дзяржавы, але быў дэпартаваны назад у Мінск, дзе і быў затрыманы. Меру стрымання і ступень яго віны, на хвілінку, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, будзе вызначаць следства». Дарэчы, падкрэсліў Аляксей Дзермант, усе вядомыя затрыманні, якія праводзіліся супрацоўнікамі КДБ у Расіі або ФСБ у Беларусі, ажыццяўляюцца з ведама, і, як правіла, пры падтрымцы калег.

Пры гэтым усе выданні і журналісты павінны дакладна ўсведамляць, што ў Беларусі маецца няўхільнасць пакарання. Такім меркаваннем у сваім Telegram-канале падзяліўся эксперт РГА «Белая Русь» Пётр Пятроўскі. Па словах аналітыка, вельмі дзіўна бачыць довады расійскіх экспертаў і журналістаў, што КП — гэта вядучы, топавы СМІ ў Расіі. «І што? Таму ён можа парушаць закон і быць беспакараны? Вельмі дзіўныя двайныя стандарты. «КП в Беларуси» ў 2020 годзе інфармацыйна абслугоўвала і падтрымлівала неверагодных. Тады, пасля першай блакіроўкі, галоўрэд Сунгоркін пабажыўся, што зменіць сітуацыю, прывядзе рэдакцыйную палітыку ў прытомнасць. Пад яго сумленнае слова сайт «КП в Беларуси» і разблакавалі. Гарантыі Сунгоркіна цяпер на нулі. Зліліся. Веры ў іх няма. А палітыка апраўдання парушэнняў выклікае шмат пытанняў, — разважае палітолаг. — Вельмі дзіўнымі былі паводзіны журналіста Мажэйкі. Ён неяк хутка збег у Маскву. Відаць, што Мажэйка разумеў усю проціпраўнасць сваіх дзеянняў у якасці супрацоўніка «КП у Беларусі». Усе выданні і журналісты павінны дакладна ўсведамляць, што ў Беларусі маецца няўхільнасць пакарання. Ніякіх прэферэнцый і недатыкальнасці няма ні ў кога, няхай гэта будзе выданне расійскае, нямецкае, беларускае ці якое-небудзь іншае».

**Пётр ДУНЬКО.**


**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**1-я очередь строительства 1-я секция в составе объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова» в г. Минске**

*Опубликованную в газете «Минский курьер» от 20.12.2019 № 145 (3359)*

**Этапы и сроки реализации строительства:**
строительство объекта предусматривается в 3-й очереди, начало строительства 1-й очереди – декабрь 2019 г., завершение строительства 1-й очереди – ноябрь 2021 г.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию:**
ноябрь 2021 г.

УНП 191581623


**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Леаніда Нікананавіча ЦІХАНАВА, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# ЗМЕНЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ І ЎЛАСНІКАЎ КВАТЭР

## СКАРАЧЭННЕ ПАДАТКОВЫХ ІЛЬГОТ — ВЫМУШАНАЯ МЕРА

Асобны блок у законапраекце рэалізаваны ў частцы мер фіскальнай накіраванасці. Гэта выклікана неабходнасцю кансалідацыі даходаў у бюджэт на ўзроўні зніжанай цэнтралізацыі даходаў, якія абумоўлены і знешняй кан'юнктурай, у першую чаргу ўплывам расійскага падатковага манеўру. Акрамя таго, дзяржаве патрэбныя дадатковыя фінансавыя сродкі, якія будуць накіраваны на раней не запланаваныя выдаткі, якія, у прыватнасці, датычацца фінансавання супрацьдзеяння каранавіруснай інфекцыі. Па гэтым кірунку ў кодэксе прадугледжана адмена асобных падатковых ільгот, а таксама дазволена мясцовым саветам дэпутатаў павышаць стаўку падатку на прыбытак у межах 2 % (гэтыя сродкі накіроўваюцца на рэалізацыю інфраструктурных праектаў).

## ПАДАТКІ ДЛЯ ЎЛАДАЛЬНІКАЎ КВАТЭР

У пачатку свайго выступлення Дзмітрый Кійко спыніўся на самым непапулярным рашэнні праекта — адмене падатковай ільготы ў дачыненні да кватэр у шматкватэрных жылых дамах. «Мэта гэтага новаўвядзення — зраўнаваць умовы падаткаабкладання гарадскіх грамадзян (якія валодаюць памяшканнямі ў шматкватэрных дамах) з жыхарамі сельскай мясцовасці, якія з'яўляюцца ўладальнікамі індывідуальнага жылля. Акрамя таго, гэтым рашэннем значна павышаецца рэсурсная база мясцовых бюджэтаў», — сказаў Дзмітрый Кійко.

Мяркуецца, што ў якасці падатковай базы будзе разліковы кошт кватэр, які вызначаецца Падатковым кодэксам. Да яго будзе прымяняцца стандартная стаўка ў памеры 0,1 %. Разліковы кошт будзе дыферэнцыраваны па гарадах, а таксама па тыпах кватэр. Паводле разлікаў спецыялістаў фінансавага ведамства, сярэдняя сума падатку па стандартнай кватэры для грамадзян у Мінску складзе каля 50 рублёў у год, у рэгіёнах — каля 25 рублёў.

Пры гэтым захоўваюцца льготы па дадзеным падатку ў дачыненні да пенсіянераў, інвалідаў, шматдзетных сем'яў і іншых неабароненых слаёў насельніцтва.

Карэспандэнт нашага выдання пацікавіўся ў намесніка міністра, як будуць цяпер плаціць такі падатак жыхары гарадоў, у якіх ва ўласнасці больш за адну кватэру. На дадзены момант у дачыненні да такіх грамадзян прымяняецца не стандартная, а павышаная стаўка (2 %) да другой і наступных кватэр.

Мяркуецца, што з наступнага года і за першую, і за другую кватэры (любую колькасць памяшканняў) уласнікі будуць плаціць падатак па стандартнай стаўцы ў памеры 0,1 % ад разліковага кошту жылля.

## КАБ «НУЛЯВЫ» ПАДАТАК НЕ ПЕРАШКАДЖАЎ КАНКУРЭНЦЫІ

Праектам Падатковага кодэкса прадугледжаны шэраг мер, накіраваных на стымуляванне дзелавой актыўнасці, лічыць Дзмітрый Кійко. Перш за ўсё гэта датычыцца пашырэння магчымасцяў па выкарыстанні інвестыцыйнага падатковага выліку, а таксама павелічэння яго памераў. Прадугледжаны меры па спрашчэнні падатковага адміністравання, перш за ўсё яны звязаны з лічбавізацыяй адміністрацыйных працэдур.

Асобны блок датычыцца сістэмных змен па падаткаабкладанні прадпрымальніцкай дзейнасці. «Гэта выклікана шэрагам абставін. У цяперашні час у нас індывідуальная прадпрымальніцкая дзейнасць можа прымяняцца ў розных арганізацыйна-прававых формах. Гэта самазанятыя грамадзяне, індывідуальныя прадпрымальнікі, збольшага мікраарганізацыі. Усе гэтыя суб'екты выкарыстоўваюць розныя сістэмы падаткаабкладання.

У выніку такой разнастайнасці сёння адзначаецца залішняя канкурэнцыя паміж самімі суб'ектамі, а таксама выкарыстанне індывідуальнага прадпрымальніцтва (ІП) у схемах па падатковай аптымізацыі. Акрамя няроўнага канкурэнтнага асяроддзя, гэта належным чынам адбіваецца і на даходах бюджэту. За апошнія гады адзначаецца такая тэндэнцыя, што, нягледзячы на рост колькасці суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, доля даходаў ад гэтых катэгорый у бюджэце не павялічваецца і традыцыйна не перавышае прыкладна 2,5 %», — адзначыў Дзмітрый Кійко.

Таму выпрацавана канцэпцыя, мэтай якой з'яўляецца дакладнае размежаванне суб'ектнага складу (самазанятасці, ІП, мікраарганізацыі). У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй у кодэксе прадугледжаны падыходы па змене падаткаабкладання.

## САМАЗАНЯТЫЯ БУДУЦЬ ЗБІРАЦЬ НА ПЕНСІЮ

Асноўныя змены датычацца самазанятасці грамадзян. «Прапануецца значна пашырыць магчымасці для дзейнасці ў дадзенай форме. Такое пашырэнне адбудзецца з 2023 года. Тады ж запрацуе заяўны прынцып. Будуць вызначаны віды дзейнасці, якімі самазанятыя не змогуць займацца. А астатнія віды будуць дазволеныя. Асноўны нюанс у тым, што гэтая дзейнасць павінна ажыццяўляцца без прыцягнення наёмных работнікаў», — распавёў першы намеснік міністра.

У планах — распрацоўка лічбавага мабільнага дадатку для самазанятасці. Ён будзе прызначаны для рэгістрацыі і выплаты ўсіх падатковых абавязацельстваў. «Устанавіўшы і выкарыстоўваючы гэты дадатак, самазаняты грамадзянін можа весці прадпрымальніцкую дзейнасць без дадатковых адміністрацыйных працэдур, без якой-небудзь дадатковай справаздачнасці. Лічбавы прадукт дазволіць самазанятым працаваць з выкарыстаннем безнаяўнай аплаты. Будзе магчыма іх узаемадзеянне як з фізічнымі асобамі, так і з арганізацыямі з асобнымі абмежаваннямі. Разлік падатковых абавязацельстваў будзе праводзіцца аўтаматычна праз лічбавы дадатак.

«Важнае новаўвядзенне: гэтая сукупная стаўка будзе ўключаць у сябе ў тым ліку адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) Міністэрства працы і сацыяльнай абароны краіны», — растлумачыў Дзмітрый Кійко.

Больш за тое, увядуць новае паняцце — «прафесійны даход». Па праекце дадзенага дакумента аб падаткаабкладанні, прафесійны даход — даход фізічных асоб ад дзейнасці, пры вядзенні якой яны не маюць работадаўца і не прыцягваюць фізічных асоб па працоўных дагаворах і (або) па грамадзянска-прававых дагаворах, а таксама даход ад выкарыстання маёмасці. Па сутнасці, гэта той жа прыбытак самазанятых.

Падатак на прафесійны даход будзе выплачвацца з даходаў фізічных асоб ад рэалізацыі тавараў і паслуг у нашай краіне. Стаўка такога падатку складзе 10 %, а з даходу, які перавысіў на працягу каляндарнага года 60 000 рублёў, — 20 %. Абкладацца падаткам на прафесійны даход будуць усе паступленні, у тым ліку і папярэдняя аплата, аванс і задатак.

## «ІНДЫВІДУАЛЫ» БЕЗ СПРОШЧАНАЙ СІСТЭМЫ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

У сувязі з такім пашырэннем магчымасцяў для самазанятасці з 2023 года таксама мяркуецца скарачэнне відаў дзейнасці, якія можна ажыццяўляць індывідуальным прадпрымальнікам.

«Тут рэалізоўваецца адваротны падыход: будуць вызначаны некалькі відаў дзейнасці, пры ажыццяўленні якіх можна будзе рэгістравацца як ІП з прыцягненнем наёмных асоб не больш за тры чалавекі. З улікам скарачэння сфер дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў і таго, што асноўная іх маса пяройдзе ў самазанятыя, мяркуецца карэкціроўка ўмоў падаткаабкладання для ІП. З 2022 года для асобных відаў дзейнасці абмяжоўваецца магчымасць прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, скарачаюцца сферы прымянення адзінага падатку. Мяркуецца, што з 2023 года для ІП застанецца магчымасць прымянення толькі агульнай сістэмы падаткаабкладання, гэта значыць, з выплатай падаходнага падатку з розніцы паміж даходамі і выдаткамі», — заявіў Дзмітрый Кійко.

## АД ІП ДА МІКРААРГАНІЗАЦЫІ

Індывідуальным прадпрымальнікам з наёмнымі работнікамі прапануюць альтэрнатыву — магчымасць пераходу ў мікраарганізацыі. Гэта будзе ўжо юрыдычная асоба, для якой захоўваецца магчымасць прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання. Для гэтага ўстанаўліваюцца адзіныя крытэрыі. «Пры гэтым у частцы выручкі гэтыя крытэрыі пашыраюцца. Гранічны крытэрый будзе каля 2,15 млн рублёў выручкі ў год. Да дасягнення гэтай выручкі будзе магчыма прымяненне спрошчанай сістэмы падаткаабкладання. Мяркуецца ўсталяваць колькасць работнікаў да 50 чалавек, а таксама адзіную стаўку падатку пры спрошчанай сістэме ў памеры 6 %», — дадаў Дзмітрый Кійко.

## ТОЙ НЕ ПАМЫЛЯЕЦЦА, ХТО АД ПРАЦЫ ХІЛЯЕЦЦА

Якіх вынікаў ад дадзеных змяненняў збіраецца атрымаць Мінфін, на якія выніковыя лічбы разлічвае? Першы намеснік міністра адзначыў, што сукупнасць усіх прапаноў дазволіць выразна размежаваць склад суб'ектаў прадпрымальніцтва, ліквідаваць перадумовы для прымянення схем па падатковай аптымізацыі, захаваць зразумелыя і простыя ўмовы для бізнесу, а таксама павысіць узровень удзелу грамадзян у фарміраванні даходаў бюджэту.

Разам з тым Мінфін не чакае, што адразу ж будзе атрыманы фіскальны эфект ад такіх мер. Дзмітрый Кійко заявіў: «Мы разумеем, што павінен прайсці трансфармацыйны перыяд, пакуль суб'екты размяркуюцца па прапанаваных катэгорыях — самазанятасці, ІП, мікраарганізацыі. Тым не менш пасля таго, як гэтая сістэма цалкам запрацуе, яе патэнцыйны эфект ацэньваецца намі ў памеры 100—200 млн рублёў у год з улікам адлічэнняў у ФСАН. Перш за ўсё гэта будзе спрыяць павышэнню рэсурснай базы мясцовых бюджэтаў, якія змогуць накіроўваць сродкі на інфраструктурныя і іншыя сацыяльныя мэты».

## ЗАКОНЫ ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ, АЛЕ І ЎЛІЧВАЦЬ МЕРКАВАННЕ БІЗНЕСУ



**Сустаршыня праўлення, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага Жанна ТАРАСЕВІЧ** на сустрэчы з журналістамі заявіла аб тым, што гэты праект закона патрабуе сур'ёзнай ацэнкі юрыстаў і іншымі экспертамі. На гэта ў бізнес-супольнасці пакуль проста не было часу.

«У той жа час варта адзначыць, што гэта спроба выраўнаваць канкурэнтнае асяроддзе паміж суб'ектамі гаспадарання незалежна ад арганізацыйна-прававой формы ўласнасці, стымуляваць рост бізнесу ад больш дробнага да больш буйнога. Калі паглядзець на прадугледжаныя праектам стаўкі, мы бачым: калі бізнес будзе расці, то хутчэй за ўсё падаткаў давядзецца плаціць менш. З пункту гледжання адміністравання таксама ёсць свае плюсы. Спрашчаюцца некаторыя моманты па пытаннях электроннага дэкларавання, асабістага кабінета і іншыя», — адзначыла яна.

Прадстаўнік бізнесу звярнула ўвагу на неабходнасць ацэнкі ўплыву прапанаваных змяненняў на цэны, занятасць, а таксама звязаных з навацыямі адміністрацыйных выдаткаў. «Таксама важна, наколькі зручна і проста самазанятым будзе працаваць з лічбавай платформай, бо сярод іх не толькі моладзь, якая лёгка абыходзіцца са смартфонамі. Акрамя таго, неабходна правесці тлумачальную работу з насельніцтвам і расказаць аб перавагах той ці іншай арганізацыйна-прававой формы прадпрымальніцкай дзейнасці. Цяпер ідуць кансультацыі з бізнесам, усе гэтыя пытанні будуць яшчэ абмяркоўвацца», — дадала Жанна Тарасевіч.



**Старшыня Рэспубліканскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Аляксандр ШВЕЦ** адзначыў, што прапанаваныя змены ў Падатковы кодэкс маюць пад сабой аб'ектыўныя перадумовы і накіраваны на барацьбу з нядобрасумленнай канкурэнцыяй. Аднак ён выказаў асцярогі з прычыны таго, наколькі хутка і эфектыўна бізнес адаптуецца да планаваных навацый. Паводле слоў Аляксандра Швеца, найбольш магутны ціск падатковага адміністравання адчуюць індывідуальныя прадпрымальнікі. «Мы прагназуем, што частка з іх сыдзе ў самазанятасць, і, на нашу думку, яны будуць плаціць у бюджэт значна менш. Частка з іх (досыць маленькая) пяройдзе ў мікраарганізацыі. Нейкая частка ІП будзе заставацца ў прамежкавым становішчы. Ужо цяпер у нас ёсць цэлы шэраг пытанняў, якія патрабуюць адказу. Нашым калегам з падатковага ведамства і Мінфіна давядзецца даваць цэлы шэраг тлумачэнняў. А па тлумачэннях, якія даюць дзяржаўныя органы, праваахоўнымі органамі яны не прымаюцца як дакумент, што мае выразную прававую прыроду», — заявіў Аляксандр Швец.

Ён лічыць, што бізнес павінен шукаць кампрамісы і разумець цяжкасці напаўняльнасці бюджэту. «Не ўсе рашэнні дзяржорганаў нам падабаюцца, але, нягледзячы на гэта, іх трэба выконваць, таму што ад гэтага залежыць стабільнасць усёй грашова-крэдытнай сістэмы краіны. Таму і бізнес-саюзы, і Міністэрства фінансаў настроены на канструктыўны дыялог».

## У КРЫЎДУ НЕ ДАДУЦЬ

Пасля выступлення прадстаўнікоў бізнесу Дзмітрый Кійко запэўніў, што прымуць меры для спрашчэння адаптацыйнага, трансфармацыйнага перыяду, калі індывідуальныя прадпрымальнікі павінны будуць прыняць рашэнне перайсці ў новую катэгорыю (самазанятасці альбо мікраарганізацыі).

Па словах прадстаўніка Мінфіна, мяркуецца распрацоўка асобнага парадку, які будзе рэгламентаваць такі спрошчаны пераход. За індывідуальнымі прадпрымальнікамі будуць аўтаматычна захоўвацца ўсе дазволы і ліцэнзіі. Будуць вырашацца пытанні, звязаныя з юрыдычным адрасам ІП, з наяўнасцю абавязацельстваў. Усё гэта плануецца ўрэгуляваць у асобным заканадаўчым акце, каб зрабіць такі пераход максімальна бязбольным.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тонкасці прафесіі

# ВЫШУК ВЯДУЦЬ... ДЗЯЎЧАТЫ

## Чаму губляюцца дзеці і ці лёгка знайсці чалавека, які ўхіляецца ад адказнасці?

**У крымінальным вышуку заўжды працавалі найбольш вопытныя і адказныя супрацоўнікі міліцыі. І калі яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму жанчынам-афіцэрам, за рэдкім выключэннем, аператыўныя справы не давяралі, то цяпер усё змянілася. Нароўні са сваімі калегамі-мужчынамі прадстаўніцы прыгожага полу паспяхова ўстанаўліваюць злачынцаў, знаходзяць тых, хто наўмысна ўхіляецца ад адказнасці, а таксама арганізоўваюць пошукі людзей, якіх з пэўнай прычыны не дачакаліся дома.**

Тонкасцямі нялёгкай, але надзвычай важнай прафесійнай дзейнасці, з нагоды Дня ўтварэння крымінальнага вышуку, з карэспандэнтамі «Звязды» падзяліліся маёр міліцыі Вольга Дунец і капітан міліцыі Юлія Дзенісеня, якія служаць у Салігорскім РАУС.



Маёр міліцыі Вольга ДУНЕЦ і капітан міліцыі Юлія ДЗЕНІСЕНЯ.

### ШЛЯХ ДА МАРЫ

Калі прыйшоў час вызначацца з будучай прафесіяй, Вольга Дунец вырашыла паступаць у Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў. «Я заўжды марыла звязаць сваё жыццё з юрыспрудэнцыяй, таму падала дакументы ў галоўную міліцэйскую ВНУ краіны», — успамінае той перыяд маёр міліцыі.

Паступіць у той час у Акадэмію МУС было надзвычай цяжка — высокі конкурс. Многія «завальвалі» іспыт па фізкультуры. Дзяўчатам увогуле надзец курсанцкія пагоны шанцавала нячаста. Вольга зрабіла ўсё дзеля таго, каб стаць адной з гэтых шчасліўках. Тады яна яшчэ не ведала, што атрымае прафесію, якая будзе ёй вельмі блізкая па духу. Пасля выпуску вярнулася на малую радзіму — у Салігорскім РАУС яна з першага дня пачала займацца вышуковай работай. У аддзеле крымінальнага вышуку маёр міліцыі служыць ужо дванаццаты год.

У яе калегі, Юліі Дзенісені, прафесійны вопыт не меншы. Хоць паступала яна ў Акадэмію МУС, як той казаў, за кампанію: стаць міліцыянерам хацела сяброўка дзяўчыны. Як аказалася ў выніку, гэта была адна мара на дваіх. Нягледзячы на тое, што прахадныя балы для дзяўчат былі вышэйшыя, чым для хлопцаў, іспыты яны паспяхова здалі — і Юлія, хоць пакуль і ў тэорыі, пачала асвойваць прафесію. Практыка пачалася з першых дзён, калі афіцэр прыйшла ў Салігорскі РАУС па размеркаванні. Тут маладога спецыяліста сустрэў не толькі добразычлівы калектыў, з якім было камфортна працаваць з першых дзён службы. У Салігорскім РАУС Юлія пазнаёмілася і са сваім будучым мужам, з якім цяпер разам не толькі ў прафесіі, а і па жыцці.

— Грамадзянскі чалавек не заўсёды можа зразумець спецыфіку нашай работы, — перакананая Юлія Дзенісеня. — Майму мужу не трэба тлумачыць, што такое сутачныя дзяжурствы, а таксама аператыўныя мерапрыемствы, якія часта адбываюцца і ў нерабочы час. У кожнага з нас — розныя задачы, аднак калі ўзнікае неабходнасць звярнуцца адно да аднаго па параду, мы карыстаемся гэтым.

### ЛЯСНЫЯ ПОШУКІ

У кампетэнцыі супрацоўніц аддзела крымінальнага вышуку Салігорскага РАУС — пошук злачынцаў, зніклых без вестак, а таксама неплацельшчыкаў даўгоў, у тым ліку тых, хто ўхіляецца ад выплаты аліментаў. Дзякуючы сучасным тэхналогіям, а таксама ўзаемадзеянню з іншымі сілавымі структурамі, знайсці такіх грамадзян нескладана. З прыходам восені работы ў афіцэраў міліцыі дабаўляецца — даводзіцца яшчэ шукаць і тых, хто пайшоў у лес у грыбы ці ягады ды заблукаў.

— Як правіла, гэта людзі сталага ўзросту, якія ідуць у лес без сродкаў сувязі, — заўважае Юлія Дзенісеня. — З году ў год мы апавяшчаем насельніцтва, як падрыхтавацца да «ціхага палявання». На жаль, людзі грэбуюць элементарнымі правіламі, у выніку здараюцца трагедыі. Калі вы сабраліся ў лес, неабходна ўзяць з сабой мабільны тэлефон (абавязкова падзараджаны!) і ваду. Апранацца трэба ярка, каб пры неабходнасці чалавека лёгка было заўважыць. Пажылым, асабліва калі ў іх ёсць праблемы са здароўем, лепш у лес не хадзіць.

Да пошукавых мерапрыемстваў часта прыцягваюцца супрацоўнікі МНС, валанцёры пошукавага атрада «Анёл», прадстаўнікі вайсковых часцей. Нядаўна на Салігоршчыне былі арганізаваны масавыя пошукі мужчыны. Перанёсшы каранавірусную інфекцыю, ён пайшоў у лес, адчуў недамаганне і заблукаў. На другі дзень, калі ён так і не вярнуўся дамоў, у міліцыю звярнуліся сваякі. Дзякуючы зладжанай рабоце вялікай колькасці людзей аматара «ціхага палявання» знайшлі. На шчасце, яго жыццю нічога не пагражала.

### КАЛІ ЗНІКАЮЦЬ ДЗЕЦІ

Не аднойчы старшаму оперупаўнаважанаму і оперупаўнаважанаму аддзялення вышуковай работы даводзілася шукаць дзяцей. Юлія Дзенісеня памятае, як аднойчы ў міліцыю звярнулася жанчына і паведаміла, што яе муж звёз малалетнюю дачку. Дзякуючы комплекснай рабоце праваахоўнікаў дзяўчынку знайшлі ажно ў Грузіі.

— Часта ў вышук трапляюць падлеткі, — расказвае Вольга Дунец. — Найчасцей уцёкі здараюцца ў няпоўных сем'ях, а таксама ў сем'ях, якія стаяць на прафілактычным уліку ў міліцыі. Неаднойчы мы знаходзілі непаўналетніх і на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Нядаўна шукалі 12-гадовага хлопца, які сышоў з хаты і на ровары з Салігорска паехаў да бабулі ў Бабруйск. У большасці выпадкаў дзеці сыходзілі з дому ў пошуку экстрыму.

Дарэчы, калі ў міліцыю звяртаецца грамадзянін і скардзіцца на адсутнасць блізкага чалавека дома, пры гэтым мяркуючы, што з ім адбылася непрыемнасць, ніхто не будзе чакаць трое сутак, каб пачаць пошукі. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку рэагуюць на паведамленне аб знікненні чалавека ў той жа дзень, калі яно паступіла.

— Людзі разумеюць, што ў некаторых выпадках, каб дапамагчы ім, патрэбен не адзін дзень, — удакладняе маёр міліцыі Вольга Дунец. — Але яны застаюцца задаволеныя нават тым, што з імі пагутарылі, іх выслухалі. Прыемна, калі людзі сыходзяць ад нас са словамі падзякі.

Аднак, як прызнаюцца дзяўчаты, не гэта галоўнае. Асаблівае задавальненне ад сваёй работы яны атрымліваюць тады, калі знаходзяць чалавека. Апошняе сведчыць аб тым, што яны робяць сваю справу якасна, сумленна служаць прафесіі, якую калісьці абралі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

Шок

# СЕМ'І БЕЖАНЦАЎ ВЫГАНЯЮЦЬ З ПОЛЬШЧЫ З ДЗЕЦЬМІ-ІНВАЛІДАМІ

**Аб гэтым паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце. «Польшча ў парушэнне міжнароднага заканадаўства адмаўляецца аказваць дапамогу бежанцам, якія бягуць ад войнаў, апасаючыся за сваё жыццё. Выключэннямі не становяцца ні жанчыны, ні нават дзеці, якія маюць інваліднасць. Польшча не толькі адмовіла дзецям-інвалідам з сур'ёзнымі захворваннямі, якім патрэбныя асаблівы догляд і медыцынская дапамога, але і выпхнула іх сем'і на лінію беларуска-польскай граніцы. Два такія выпадкі зафіксаваныя на ўчастку Брэсцкай пагранічнай групы», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.**

Беларускія пагранічнікі выявілі шматдзетную сям'ю з Ірака з дзіцем з ДЦП. Тата расказваў, што ўвесь шлях нёс дзіця на руках з надзеяй, што ў Еўропе яго сын зможа атрымаць неабходнае лячэнне і шанц на нармальнае жыццё. Аднак замест чалавечай спагады і ў парушэнне правоў дзіцяці, польскія сілавікі даставілі ўсю сям'ю на польска-беларускую граніцу і спрабавалі прымусіць незаконна прайсці ў Беларусь.

Аналагічны выпадак адбыўся з сям'ёй грамадзян Ірака з двума дзецьмі-інвалідамі. Па словах жанчыны, у абодвух дзяцей аўтызм. Ім неабходныя асаблівы догляд і адукацыя, якіх няма ў Іраку. Нягледзячы на просьбы маці застацца ў Польшчы для лячэння дзяцей, пагранічная варта паступіла з імі гэтак жа, як і з папярэдняй сям'ёй, якая апынулася ў безвыходным становішчы.

«Выціскаючы бежанцаў з дзецьмі-інвалідамі, польскія сілавікі пазбаўляюць іх тых правоў, якія абавязаўся забяспечыць Еўрасаюз. Акрамя таго, з прычыны недапушчэння праваабаронцаў на польскую граніцу, міжнародныя арганізацыі па правах дзіцяці таксама застаюцца абыякавыя да жыццяў і здароўя дзяцей, за чые правы яны актыўна змагаюцца, але ў рэальнасці атрымліваецца — толькі на словах», — падкрэслілі ў ДПК.

**Пётр ДУНЬКО.**

Чулі?

# INSTAGRAM, WHATSAPP І FACEBOOK «ПРЫЛЕГЛІ»




## У сацсетках і месенджарах адбыўся маштабны збой

**Карыстальнікі з усяго свету ў панядзелак увечары пачалі паведамляць аб збоях. Але сэрвісы кампаніі працяглы час заставаліся недаступныя. Праблемы закранулі і дзясяткі іншых папулярных сайтаў — карыстальнікі паведамлялі пра памылкі ў рабоце TikTok, YouTube, Netflix, Snapchat, Tinder і нават Twitter. Праблемы назіраліся ў аператараў сувязі, банкаў і авіякампаній. Збой па праве назвалі самым маштабным у гісторыі.**

Па даных Downdetector, які адсочвае работу папулярных інтэрнэт-рэсурсаў, непаладкі закранулі ўвесь свет. Аб збоях паведамлялі карыстальнікі з Еўропы, Азіі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. У карыстальнікаў Facebook узніклі праблемы пры выкарыстанні сайта, у Instagram часткова ці цалкам не працаваў мабільны дадатак. Карыстальнікі WhatsApp таксама не маглі зайсці ў праграму і скардзіліся на праблемы з падключэннем да сервера.

«Нам вядома, што некаторыя карыстальнікі адчуваюць праблемы з доступам да нашых дадаткаў і прадуктаў. Мы працуем над тым, каб усё выправіць як мага хутчэй, і мы просім прабачэння за нязручнасці», — заўважылі ў Facebook. Прычын не назвалі, аднак некаторыя спецыялісты мяркуюць, што да праблем маглі прывесці непаладкі ў рабоце DNS-сервераў, якія выкарыстоўвае інтэрнэт-кампанія.

Карыстальнікі пачалі масава пераходзіць у месенджар Telegram. Нагрузка на яго серверы рэзка вырасла, з-за чаго пачаліся пэўныя праблемы: хтосьці не мог спампаваць дадатак, іншым паведамлялі пра затрымкі з адпраўкай паведамленняў. На старонцы месенджара ў сацыяльнай сетцы Twitter было апублікавана паведамленне аб тым, што Telegram рады прыліву новых карыстальнікаў, аднак іх было настолькі шмат, што серверы пачалі працаваць з затрымкай. На шчасце, цалкам сэрвіс не «ўпаў» і даволі хутка работа наладзілася.

Пасля паведамленняў аб глабальным збоі ў рабоце сэрвісаў заснавальнік і кіраўнік Facebook Марк Цукерберг пазбавіўся 6,6 мільярда долараў. Акцыі кампаніі ўпалі больш чым на 5 працэнтаў. Мільярдэр апусціўся на шостае месца ў спісе найбагацейшых людзей планеты, сведчаць даныя Forbes.

А польскія СМІ, як той казаў, пад шумок пачалі піярыць нацыянальную сацсетку Albicla. «Наведайце albicla.com, зарэгіструйцеся і атрымлівайце асалоду ад свабоды слова!» — заклікаў, у прыватнасці, польскі партал Niezalezna.pl. У гэтым усе палякі.

**Захар БУРАК.**

# АЦЯПЛЯЛЬНЫ СЕЗОН СТАРТАВАЎ. ШТО ДАЛЕЙ?

## ЦІ ГАТОВЫ ГРОДЗЕНСКІЯ СПАЖЫЎЦЫ ЦЕПЛАВОЙ ЭНЕРГІІ ДА ВЫПРАБАВАННЯ ХОЛАДАМ

**Сёлета гарачая вада ў батарэі цэнтральнага ацяплення была пададзена амаль на месяц раней, чым летась. Увогуле, такога ранняга падключэння не памятаюць самі энергетыкі. Прыгадваюць 2013 год, але тады цяпло стала паступаць у апошні дзень верасня. Звычайна ацяпляльны сезон пачынаецца ў кастрычніку. Але сёлета мясцовыя ўлады скарацілі тэрміны падпісання пашпартоў гатоўнасці з-за ранніх халадоў. Між тым дзе-нідзе можна назіраць, як вядзецца перакладка цепласетак. Напрошваецца пытанне: ці не ўзнікне ў сувязі з гэтым перабояў з цяплом? Наколькі верагодна прайсці ацяпляльны сезон без аварыйных сітуацый? Разабрацца ў гэтым «Звяздзе» дапамог самы буйны пастаўшчык цяпла Гродзенскага рэгіёна.**



У Гродне некалькі, што называецца, пастаўшчыкоў цяпла. Самым буйным лічыцца філіял «Гродзенскія цеплавыя сеткі» РУП «Гроднаэнерга». На яго балансе — каля 600 кіламетраў трубаправоду. Цэлы падземны горад. Эксплуатацыя сама па сабе складаная, а тут яшчэ накладваюцца даволі значныя перапады вышыні, якія дасягаюць 50—60 метраў. Каб гэта ўявіць, дастаткова паглядзець на 15—20-павярховы дом. Дарэчы, такі складаны падземны рэльеф датычыцца менавіта Гродна. Зразумела, што трымаць у парадку такую гаспадарку няпроста.

**Скарачаецца і тэрмін адключэння гарачай вады ў кватэрах. Напрыклад, цяпер у Гродне гэты перыяд доўжыцца не 14 дзён, як было раней, а толькі 10.**

— Сапраўды, у горадзе можна бачыць траншэі, дзе мяняюць трубаправоды. Гэту работу мы вядзём не толькі ў летні сезон, але і да моцных халадоў. Цеплазабеспячэнне ў такім выпадку не будзе спыняцца, сучасныя тэхналогіі дазваляюць гэта рабіць без адключэння цяпла. Зімой кладзецца часовы трубаправод, што дазваляе працаваць нават у асенне-зімовы час, — запэўніў **дырэктар Гродзенскіх цепласетак Генадзь КУПРАШ**.

Між тым многія памятаюць, што раней пры аварыі трубапровада даводзілася некалькі дзён знаходзіцца без цяпла, гэта ў лепшым выпадку. Як правіла, праблемы стваралі старыя трубы, якія эксплуатаваліся і 50, і 60 гадоў. Таму на прадпрыемстве першымі ў краіне пачалі замену іх на сучасныя — перадызаляваныя. Іх перавага ў тым, што яны значна скарачаюць цепластраты і павышаюць надзейнасць у эксплуатацыі, бо ізаляцыя не прапускае вільгаць, якая псуе трубы.

Па словах дырэктара, дынаміка работы даволі высокая, апошнім часам за год мяняецца па 20 кіламетраў трубаправода. Больш за палову падземных цепласетак ужо замянілі. І гэты працэнт павялічваецца. Усё робіцца дзеля таго, каб павысіць надзейнасць цепласетак, а значыць, забяспечыць бесперабойную падачу цяпла спажыўцам.

У найбліжэйшыя тыдзень-два ўсе трубы, якія знаходзяцца на тэрыторыі прадпрыемства, будуць пушчаны ў ход. На будучы год плануецца замяніць 25 кіламетраў старога трубаправода. Гэта вялікі аб'ём, кажа дырэктар філіяла. Дарэчы, выпуск сучасных труб наладзілі шэраг заводаў Беларусі, таму дэфіцыту ў пастаўках няма. А вось спецыялістаў, якія выконваюць гэту работу, не хапае.

— Ёсць ліміт па падрадчыках. У асноўным пракладку вядуць гродзенскія спецыялісты. У нас вельмі сур'ёзныя патрабаванні па якасці, мы не дапусцім нядбайнасці, — падкрэслівае дырэктар.

Замена старых труб мае яшчэ адзін значны бонус для спажыўцоў, бо скарачае тэрмін прафілактыкі і рамонту ў міжацяпляльны перыяд. Адпаведна скарачаецца і тэрмін адключэння гарачай вады ў кватэрах. Напрыклад, цяпер у Гродне гэты перыяд доўжыцца не 14 дзён, як было раней, а толькі 10. А ў будучыні плануецца наогул адмовіцца ад адключэння гарачага водазабеспячэння ў летні перыяд.

Як паведаміў першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер філіяла Барыс Мітрычэнка, мадэрнізацыя сістэмы дазволіла ўключыць цяпло літаральна за 2-3 дні. Надзейнасць цеплазабеспячэння павысілася з устаноўкай электракатла на ТЭЦ, першага ў краіне. У аўтаматычны рэжым пераводзяцца помпавыя станцыі, якія забяспечваюць раўнамерную падачу вады. Гэта патрэбна для таго, каб цяпло і электраэнергія бесперабойна даходзілі да спажыўца, паколькі канчатковы спажывец знаходзіцца за 15 кіламетраў ад цеплавузла, а цеплавая хваля ідзе больш чым пяць гадзін.

— Імкнёмся да таго, каб знізіць уплыў дыспетчара на цеплавыя працэсы, яны будуць весціся ў аўтаматычным рэжыме, — дадаў **начальнік дыспетчарскай службы філіяла Аляксандр ЛЯВОНАЎ**.

Мадэрнізацыя дыспетчарскага пункта ўпраўлення дазваляе ў рэальным часе сачыць за ўсімі параметрамі аб'ектаў. Напрыклад, выхад вады павінен быць не ніжэйшы за 50 градусаў, гэта сацыяльны стандарт. Дзякуючы электроннай сістэме «Цеплаграф», якая распрацавана і ўстаноўлена сумесна з расійскімі партнёрамі, на працягу хвіліны можна знайсці кожны дом у горадзе і атрымаць поўную інфармацыю аб нагрузцы, тэрмінах пракладкі цепласетак, на чыім балансе знаходзіцца. Найбольш значная праграма датычыцца сістэмы лакалізацыі аварый. Калі дыспетчару паступае такі сігнал, сістэма яму падказвае, які найбліжэйшы кабель трэба закрыць, а таксама інфармуе аб тым, якіх спажыўцоў трэба адключыць. Гэта значна скарачае тэрмін лакалізацыі аварыі.

Цяпер даследуюцца ўсе магістральныя трубаправоды, каб пазбегнуць аварый падчас ацяпляльнага перыяду. Дакладнае месца вызначае аварыйна-дыягнастычная служба, якая створана на прадпрыемстве 10 гадоў таму. Работа вядзецца прыборамі для відэанагляду і цеплаправізарамі. На трубаправодах, дзе, магчыма, ёсць праблема, устанаўліваюцца два датчыкі. Іх сігналы прымае вылічальны прыбор, які на аснове гукаў паказвае максімальную даўжыню пашкоджання. Дакладнасць вельмі высокая — да аднаго сантыметра. Такім чынам, можна бачыць, што адбываецца пад зямлёй.

Асноўны пік работ прыпадае на асенне-зімовы перыяд, бо ў гэты час асабліва высокія нагрузкі на цепласеткі. Таксама выкарыстоўваецца дрон з цеплавізуальнай камерай. Для аптымальнага кантролю за станам трубаправода ўстанаўліваюцца спецыяльныя датчыкі, якія распрацаваны на прадпрыемстве. Ёсць і праграма па іх устаноўцы. Яны дазваляюць кантраляваць цеплавыя сеткі праз сістэму GSM. У наступным годзе ўсе трубаправоды прадпрыемства будуць абсталяваны такімі датчыкамі. Заўважана, што пашкоджанняў, дзякуючы рэканструкцыі, з кожным годам становіцца менш. Адпаведна, менш і прафілактычных рамонтаў.

Яшчэ да пачатку ацяпляльнага сезона РУП «Гроднаэнерга» распрацаваны варыянты рэжымаў энергазабеспячэння спажыўцоў на асенне-зімовы перыяд. Ёсць графікі абмежаванняў падачы электра- і цеплаэнергіі пры ўзнікненні аварыйных сітуацый. Адрамантавана паравая турбіна і генератар. Энергетыкі праклалі каля 30 кіламетраў цеплавых сетак — 94 % ад гадавога задання.

Значны аб'ём па падрыхтоўцы да асенне-зімовага перыяду выканалі арганізацыі ЖКГ. Зроблены прафілактычны рамонт 443 кацельных і 255 цеплавых пунктаў. Праведзены гідраўлічныя іспыты звыш дзвюх тысяч кіламетраў цеплавых сетак, на 90 % завершана замена цепласетак. На базе камунальнай гаспадаркі створаны 72 аварыйныя брыгады з адпаведнай тэхнікай і матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі для ліквідацыі надзвычайных сітуацый у ацяпляльны перыяд. Ёсць неабходная колькасць перасовачных крыніц энергіі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

### У тэму

Як паведамілі ў аддзеле энергетыкі, транспарту і сувязі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гродзенскага аблвыканкама, уключэнне ацяплення сёлетняга сезона прайшло без аварыйных сітуацый. У рэгіёне выкананы ўсе запланаваныя мерапрыемствы па рамонце абсталявання, перакладцы цеплассетак, створаны неабходны запас паліва. Сюды ўваходзяць мазут, драўляныя паліва і торфабрыкет. Заяўкі спажыўцоў па цвёрдым паліве поўнасцю выкананы. Праведзены работы па расчыстцы прасек і ліквідацыі небяспечных дрэў, якія пойдуць у якасці паліва спажыўцам. Стабільную работу энергасістэмы забяспечвае РУП «Гроднаэнерга» і арганізацыі ЖКГ.

Як паказвае вопыт апошніх гадоў, ацяпляльны сезон значна павялічваецца — ён пачынаецца раней, а завяршаецца пазней за традыцыйна ўстаноўленыя тэрміны. Таму на будучы год мяркуецца перагледзець тэрміны здачы пашпартоў гатоўнасці, каб «сюрпрызы» надвор'я не засталі камунальныя службы і жыхароў рэгіёна непадрыхтаванымі.

Экалогія

# ВОДНЫ КАМБАЙН ДЛЯ СВК

## Як збіраюцца чысціць рэкі і ахоўваць падземныя воды на Віцебшчыне



**Бадай, самай цікавай навіной у пытанні аховы прыроды Падзвінскага краю можна назваць рашэнне аб набыцці ўжо налета «амфібіі», якая будзе чысціць і паглыбляць рэчышча Віцьбы. З часам у вобласці іх стане некалькі. Пра гэта нядаўна паведаміў старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ падчас пасяджэння.**

Ён таксама параіў кіраўнікам мясцовых улады набыць аналагічныя гідратэхнічныя машыны — адну на дватры раёны. Гэта дазволіць палепшыць экалагічны стан вадаёмаў, зрабіць іх прыгажэйшымі, мясціны вакол — больш утульнымі і прываблівымі для адпачынку.

Віцьбе неабходны «механічны доктар» яшчэ і таму, што пасля дажджоў у яе сцякае вада з вуліц горада, што негатыўна ўплывае на стан ракі. У выніку плынь вады слабая, падчас спякоты ўзровень падае, берагі агаляюцца і зарастаюць.

Нюансы агучыў **старшыня абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ГАЛАНАЎ**. Ён адзначыў і, мякка кажучы, адсутнасць энтузіязму ў такім важным пытанні, як тампанаж артэзіянскіх свідравін. Гэта абавязкова трэба рабіць з свідравінамі, якія ў працэсе эксплуатацыі прыйшлі ў непрыдатнасць, а рамонт іх немагчымы або нерэнтабельны з тэхнічных, санітарных, эканамічных ці іншых прычын. Цана пытання для адной — да 10 тысяч рублёў. Па тэмпах раёны адстаюць значна. У прыватнасці, толькі сёлета запланавана выканаць тампанаж сарака свідравін, а зроблена пакуль у чатыры разы менш. Для параўнання, па прадухіленні забруджвання падземных водаў у 2020 годзе выканаць ліквідацыйны тампанаж 97 водазаборных свідравін. Усяго ў вобласці падлягаюць тампанажу 718.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта даручыў пачаць актыўна займацца гэтай важнай справай, тым больш што яна ў рамках выканання мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні населеных пунктаў.

Паўночная вобласць Беларусі вядомая як водны край. Яна найбольш забяспечаная воднымі рэсурсамі, якіх дастаткова для задавальнення сучасных і перспектыўных патрэб.

На тэрыторыі рэгіёна працякаюць тры вялікія ракі (Заходняя Дзвіна, Дняпро, Бярэзіна), дзве сярэдніх (Вілія, Друць) і 616 малых вадацёкаў.

Каля пятай часткі тэрыторыі на паўднёвым усходзе належыць басейну Дняпра і 80 % адносіцца да басейна Заходняй Дзвіна, адной з галоўных рэк Беларусі. Нязначная тэрыторыя знаходзіцца ў басейне ракі Нёман.

Вылучае вобласць і наяўнасць вялікай колькасці азёраў — 1360, агульная плошча люстра якіх складае каля тысячы квадратных кіламетраў.

Самымі буйнымі азёрамі вобласці з'яўляюцца Асвейскае — плошчай 52,6 квадратных кіламетра (другое ў краіне пасля Нарачы), Лукомскае — 37,7 квадратных кіламетра, Дрывяты — 36,1.

На Віцебшчыне разведана 56 радовішчаў прэсных падземных водаў і 29 радовішчаў мінеральных падземных водаў.

У рамках супрацоўніцтва з Расіяй у галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання трансгранічных водных аб'ектаў праводзяцца работы па ацэнцы якасці паверхневых водаў трансгранічных вадацёкаў басейна ракі Заходняя Дзвіна, якія паступаюць з тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

На працягу шэрага гадоў якасць паверхневых водаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці, трансгранічных участках рэк на мяжы з Расійскай Федэрацыяй і з Латвіяй не змяняецца і па гідрахімічным статусе характарызуецца, як «добрая».

Станоўчая навіна і наконт таго, што ў бягучай пяцігодцы на Віцебшчыне запланавалі пабудаваць або капітальна рэканструяваць больш за дзесяць камунальных ачышчальных збудаванняў: у абласным цэнтры і Оршы, Віцебскім, Мёрскім, Полацкім, Глыбоцкім, Браслаўскім раёнах. Гэта будзе зроблена ў рамках рэалізацыі праграмы «Чыстая вада» на 2021—2025 гады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# СМАК ЖУРАВІН,

## альбо Усё праходзіць — апроч жыцця...



**Сезонны клопат: на згон вясны схаваць падалей зімовыя рэчы (вопратку, абутак) — дастаць летнія і цвёрда вырашыць, што ўжо сёлета (хопіць маек-джынсаў-красовак!) трэба хоць трохі панасіць сукенкі і сарафаны, «выгуляць» басаножкі і туфлі...**
**Сезонны клопат: у пачатку восені прыбраць з-пад рук так і не надзетыя сукенкі-сарафаны, так і не абутыя туфлі...**
**Кароткае, на жаль, лета.**
**Ці... занадта поўная шафа?**

### ЭЎРЫКА?

Улетку (ды на лецішчы) тэлевізар амаль не ўключаецца. Ні часу на яго, ні здароўя. Да таго ж рэклама, што яд, супраць якога...

Ну хіба навіна? Ці ведалі вы, напрыклад, што абрыдлы ўсім містар Пропер спачатку прыдумаў шампунь? І нават ім карыстаўся... Пакуль не заўважыў, што ад гэтай вынаходкі ў яго катастрафічна выпадаюць валасы...

Тады ён зразумеў, што падобнай брыдотай лепш усё ж мыць падлогу.

### СЛЕДАМ...

Урок беларускай: нашы суседзірасіяне ходзяць за (за грибами, за водой, за справкой в ГАИ, за кем-то, чтобы забрать с собой)... Беларусы ходзяць у альбо па — у грыбы, у ягады, па хлеб, па ваду, па лекі, па дзяўчыну, каб разам пайсці...

Што цікава, можна хадзіць і ЗА ёй (той дзяўчынай альбо некім іншым), але гэта азначае следам...

Прыклад? Калі ласка.

Горад, метро. На ім мы даязджаем да патрэбнай станцыі і выходзім, па шырокіх прыступках падымаемся ўверх — за дзяўчынай у, мякка кажучы, кароткай маленькай спадніцы і (мода!) вялізных груваcтких чаравіках.

З адным чаравікам, відаць, нешта адбываецца (шнурок развязаўся ці што?), дзяўчына згінаецца, каб яго завязаць...

Карціна алеем, карацей... Для тых, хто знізу.

Для іх жа кароткі анекдот: «Міця, глянь, калі я нахіляюся, трусікі не відаць?» — «Не, але магла б і надзець».

### НА БЯЗРЫБ'І

Віталіна — чалавек адказны: за ўчынкі і словы, за ўсё, што робіць. Ну, у прыватнасці, калі яна гатуе абед, значыць, яна гатуе абед, а не збірае з таго, што засталося ад учарашняй вячэры альбо сённяшняга сняданку...

У тую суботу рыбу сям'і абяцала, а таму зранку пакіравала ў краму, дзе найлепшы выбар.

Прайшлася там, паглядзела, што прадаецца, пачым, і ўздыхнула: больш-менш прымальная цана — хіба на хек ды мінтай...

— Вы нешта бераце? — пачула раптам над вухам.

— Думаю пакуль, — сказала Віта, адступаючы перад жанчынай, якая тут жа схілілася над тушкамі мінтая і, перабіраючы іх, забубніла:

— Так, гэтую рыбку бяром, гэтую не...

— Вы, падобна, сакрэт нейкі знаеце?.. Дык падзяліцеся, — папрасіла Віта. — А то адзін раз гэтую рыбу возьмеш і са смакам з'ясі, а другі...

— Мы яе зусім не ядзім, — буркнула ў адказ жанчына. — Я катам купляю.

— О-о, дык ім файна ў вас жывецца!

— Гэта не ў нас... Я вулічных кармлю.

...Ні ў той дзянёк, ні праз тыдзень — рыбу Віта не гатавала.

### НА ЎСЁ СВАЯ ПРЫЧЫНА

Зручная рэч мабільнік, бо не проста звініць, а яшчэ і піша, хто на провадзе...

Тым разам — як быццам Іванаўна, хоць голас — ну зусім не яе! «Дык гэта ўсё зубы, — сказала жанчына. — Пакуль працавала, часу не было, каб імі займацца. Думала, выйду на пенсію і ўсё зраблю. А тут — хату ў вёсцы да ладу давяла і ўсё: на зубы грошай няма».

Раней — не было часу.

### КОЛА

У сваячкі двое дзяцей: дачушцы пяць, ходзіць у садок, а сын — той студэнт ужо, днямі першую стыпендыю дадому прынёс.

Бацькі з гэтай нагоды надумалі свята зладзіць, купілі торт.

— Ну і калі ж мы яго есці пачнём?! — не магла дачакацца малая. — Калі тую пенсію адзначым?

Мама хацела была паправіць — сказаць: «Не пенсію, а стыпендыю», а потым махнула рукой, падумала, што няма ў тым прынцыповай розніцы: студэнт ці пражывае за стыпендыю без дапамогі бацькоў, а пенсіянер — часцяком — за пенсію без падтрымкі дзяцей?

### ДЗІВА

Восень, вёска, могілкі і магілкі. На нечай чужой — помнік з кранальным: «Родители не умирают, они на время покидают нас», на дзядзькавай — дзве яркія спелыя малінаўкі.

І гэта, як быццам, не дзіва, бо ён быў добры садавод — тут, у акрузе, прышчапіў проста безліч яблынь!

І разам з тым — дзіва, бо калі тое было, а нехта, бач, не забыўся!

### ...З ТАГО СВЕТУ?

У Антонаўны сабачка, якіх пашукаць, — рыжы, вясёлы, разумны.

Грэх не спытаць, дзе ж такога ўзяла?! «Не паверыце — муж прыслаў», — сумна ўсміхаецца жанчына і расказвае, як ён — досыць малады — раптоўна памёр, як яна тады шалела ад гора — дзеці з месяц «пасвілі», каб з сабой чаго не зрабіла, як настаў ім час ад'язджаць (работа, вучоба...), і як яна тады ўслых пашкадавала, што ў доме — ні ката, ні сабачкі, ніводнай жывой душы: загаварыць і то няма з кім!.. І як пасля, раніцай, адкрыла дзверы і за імі ўбачыла рыжыка.

Ва ўсіх пыталася: можа, ведае хто, чый ён, бо дамашні ж сабачка?

Ніхто не азваўся, не прыехаў і, дзякаваць богу, не забраў. Жыве — пасланцом... З таго свету?

### ЛЮДЗІ — НЕ ЛЮДЗІ

У лес, як у храм... А ўжо там... Свая воля — застаўся б!.. Каб надыхацца, каб налюбавацца... Каб аднойчы выйсці на акопы — старыя, пакручастыя, каб, гледзячы ўніз, міжволі пакланіцца светлай памяці людзей, што капалі іх (рыдлёўкамі, месцамі — вышэй галавы!), што, напэўна ж, трымалі тут абарону, сплывалі крывёй, паміралі...

Гэта было некалі.

Цяпер у тыя ж акопы нехта скідвае смецце.

Прытча (мо і не да месца?). Па дарозе крочылі двое. Ім — бацьку з малым — відаць, цікава было размаўляць, глядзець па баках... Прычым настолькі, што старэйшы не заўважыў пад нагамі каменя і моцна пабіў нагу — завойкаў, застагнаў...

Назаўтра той самай дарогай яны ішлі назад, і (яно ж бывае!) бацька зноў спатыкнуўся — з усімі адсюль наступствамі... А таму трэцім разам, падыходзячы да знаёмага месца, ён успомніў сам і малому сказаў: «Глядзі пад ногі, бо тут...»

Удвух яны сталі круціць галовамі, узірацца, шукаць вачыма той камень і не знайшлі... «Я адкінуў яго», — сказаў ім стары, што сядзеў на ўзбочыне. «О-о, вы таксама спатыкнуліся і пабілі нагу?» — здагадаўся хлопчык. — «Не, гэтага не было», — сказаў яму дзед. — «А чаму ж адкінулі?» — «Таму што я чалавек».

...Іх, скажам так, чалавекаў, людзей, адказных за іншых, — на дарогах жыццёвых шмат.

Не-людзей хапае, на жаль, таксама.

### МОЖА...

Чалавека няма, сышоў ён у лепшы свет, а лісты яго засталіся. З даўняга: «Муж аднекуль прынёс шчанюка — беспароднага, «двартэр'ера». Будзе, маўляў, наш двор пільнаваць, каровак пасвіць. І ў лес з ім хадзіць весялей...

Падрастае малы, бегае па двары. Ідзеш — скача на цыбе, круцiцца пад нагамі, хапае за адзежу.

Праганяеш яго, пакрыкваеш — яму хоць бы хны, а спынішся, пагладзіш па галаве — і суцішыцца, прытуліцца да нагі, глядзіць у вочы: слухае, слухае, слухае...

Вось і людзі б так — адзін з адным гаварылі. Можа, пачулі б? Можа, паразумеліся?»

Можа.

### ХТО ПРАЦУЕ, ТАМУ І ШАНЦУЕ

...Апошнім часам гэты ўнук да бабулі амаль не прыязджаў. Яно і зразумела: у вёску, далекавата, ды і што там рабіць? А тут...

Ён правы якраз атрымаў. Сябар даваў машыну. А ў бабулі — дзень нараджэння... Дык чаму б не купіць які падарунак і не махнуць: з раднёй за сталом не пасядзець, не дапамагчы, калі што спатрэбіцца?

Добрым часам з'явіўся: на бульбу якраз...

Пасля чаго бабуля ўсю ноч думала, які ж ён малайчына, што ўзяў ды прыехаў — і павіншаваў, і дапамог... Трэба было б аддзячыць. Але чым?.. Грошы ў кашальку цяпер не трымаюцца... Тады нечым з прадуктаў? Дадумайся, чым: дарослы ж хлопец і амаль мінчанін (з райцэнтра пераехаў), зарабляе, бач — на машыне ездзіць... Дык ён што — нейкай бульбы-капусты сабе не купіць, яблыкаў ці варэння?.. І тое ж сала — прадукт на аматара. Моладзь яго, можа, і ці есць? Пачну даваць, — дык яшчэ пакрыўдзіцца, а не пачну...

Да раніцы бабуля думала, а перад ад'ездам такі спытала:

— Можа, ты што з прадуктаў з сабою возьмеш?

— Канешне, бабуля! — згадзіўся хлопец.

— Нарыхтовак маіх? І бульбачкі? — узрадавалася гаспадыня. — І салка...

— Усё-ўсё вазьму, што ты дасі! Нам у інтэрнаце вельмі спатрэбіцца!

...Анекдот: бабуля з вёскі і сапраўды можа перадаць унуку і смятанкі, і мяска, і бульбачкі, і яек...

Бабуля з горада — хіба прывітанне.

### НЕ ПРА СМАК

Цуд, як прыгожа растуць журавіны! Ідзеш па балоце, — іх быццам няма? Ну хіба што недзе — адна?.. А мох каля яе расхінеш і...

Збірай бы і збірай, калі многа было б, але і так...

За шчасце прынесці дамоў, перабраць, падзяліцца з суседкай і яе ж падбіць на ўспаміны: пра тое, як яна штовосень ставіла капусту — і сабе, і дарослым дзецям, як спецыяльна для гэтага хадзіла на базар купляць журавіны... А неяк ёй там не пашчасціла — ягад не было. І ўнук (што вельмі здзівіла!) у свае пяць гадкоў вось гэта заўважыў, спытаў: «Бабуля, а дзе ж чырвоныя ягадкі?»

...Сёлета — хоць няшмат — ды яны ў капусце будуць.

І да болю шкада, што той улюбёны ўнучак гэтага не ўбачыць (хіба па скайпе?) і бабулінай хрусткай капусты зімой не паесць, бо ён — ужо дарослы і, як той казаў, пасляховы — у Амерыцы цяпер жыве.

Бабулі туды — і праўда — хіба з прывітаннем?

### УСЁ ПРАХОДЗІЦЬ...

Верачка — позняе дзіця. Ёй шаснаццаць было, калі трагічна загінуў бацька. На пахаванне ўся акруга тады сышлася. Людзі спачувалі ўдаве, шкадавалі дзяцей. Казалі: «Такі дабрэнны чалавек быў! І такі малады!..»

Вось гэтаму, апошняму, Верачка не верыла: бацьку як-ніяк добра за 50!

...Столькі ж ёй цяпер самой. Кажа: «Я такая маладая... Быццам не жыла яшчэ!»

І сапраўды — усё праходзіць, апроч жыцця. Жыццё — яно пралятае.

**Валянціна ДОЎНАР.**

---

Асцярожна: кібермахлярствы

# АХВЯРА ВІРУСА

## Жыхарка Іўеўскага раёна выявіла спісанне з тэлефона 200 рублёў

**Аб гэтым яна даведалася ад аператара сотавай сувязі праз SMS-паведамленне. Такая высокая запазычанасць здзівіла жанчыну, і яна звярнулася па дэталізацыю званкоў. Высветлілася, што з яе нумара тэлефанавалі за мяжу. Аднак жанчына запэўніла, што на замежныя нумары яна не тэлефанавала, што было пацверджана пасля раздрукоўкі выклікаў. Затым пацярпелая звярнулася ў міліцыю.**

Па дадзенай справе была прызначана судовая камп'ютарна-тэхнічная экспертыза. Эксперты праз антывірусную праграму высветлілі, што ў мабільным тэлефоне змяшчалася каля 80 шкодных файлаў. Некаторыя вірусныя праграмы маглі цалкам кіраваць устаноўленымі дадаткамі. У прыватнасці, тэлефанаваць без ведама ўласніка, адпраўляць паведамленні, нават кіраваць банкаўскімі рахункамі, якія «прывязаныя» да тэлефона, і гэтак далей.

Якім чынам шкодныя праграмы трапілі ў тэлефон, вызначыць складана. Магчыма, жанчына пры ўстаноўцы нейкай праграмы ці пераходу па спасылцы «занесла» заражаны файл. Цяпер гэта высвятляе міліцыя.

Каб не стаць ахвярай кібермахляроў, **намеснік начальніка аддзела экспертыз камп'ютарных сродкаў, тэхналогій, фонаскапічных і лінгвістычных экспертыз УДКСЭ па Гродзенскай вобласці Віталь РЫНКЕВІЧ** рэкамендуе ўстанавіць на сваіх прыладах антывіруснае праграмнае забеспячэнне і запусціць праверку. Абавязкова выдаліць тыя файлы, якія праграма вызначыць падазронымі. Пры гэтым антывірусная праграма павінна ўвесь час абнаўляцца.

Эксперт раіць правераць спіс дадаткаў. Калі сярод іх ёсць невядомыя, лепш іх выдаліць. Вельмі важна, лічыць эксперт, не загружаць у тэлефон файлы і не пераходзіць па спасылцы ў пісьмах, дасланых невядомымі адпраўшчыкамі. Яны могуць утрымліваць вірус. Перад тым як устанавіць любую праграму ці дадатак, варта добра азнаёміцца з імі, вывучыць водгукі. Асабліва ў тых выпадках, калі ідзе запрос нумара тэлефона ці іншых даных. Таксама не рэкамендуецца падключаць свае гаджэты да чужых смартфонаў і камп'ютараў. Кібермахляры могуць атрымаць такім чынам доступ да ўсёй інфармацыі, якая захоўваецца на прыладах.

Апошнім часам нямала пацярпелых ад кібермахляроў. Эксперт прыводзіць прыклад такой схемы падману. Чалавеку тэлефануе быццам бы работнік банка і просіць устанавіць праграму, якая дазволіць аддалена кіраваць мабільным тэлефонам. Маўляў, гэта засцеража клiента ад махляроў, якія імкнуцца зняць сродкі з банкаўскіх картак. Калі чалавек выконвае «рэкамендацыю», ён дае поўны доступ да кіравання сваёй мабільнай прыладай. У выніку — пазбаўляецца грашовых сродкаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# «Хваробы прастаты, эрэктыльная дысфункцыя і бясплоддзе — звёны аднаго ланцужка»

## Уролаг пра мужчынскія (і жаночыя) праблемы

**Як на мужчынскае здароўе ўплывае ковід? З якімі сімптомамі не варта марудзіць, а трэба неадкладна звяртацца да ўролага? У якім узросце неабходна пачынаць праверацца на рак прастаты і якія аналізы здаваць? Да чаго прыводзіць сядзячы лад жыцця? З якімі хваробамі да ўролага звяртаюцца жанчыны? Чым небяспечныя частыя цыстыты? Пра гэта і іншае «Звяздзе» расказаў урач анколаг-уролаг вышэйшай катэгорыі Святаслаў ПАПОЎ.**



### ЗДАВАЦЬ АНАЛІЗ НА ПСА Ў 25 НЕ МАЕ СЭНСУ

***— Святаслаў Васілевіч, ці ёсць сезоннасць у мужчынскіх захворваннях? Ці павялічваецца з надыходам халадоў колькасць пацыентаў ва ўролага?***

— Дакладней было б сказаць, што ёсць сезоннасць абвастрэння хранічных захворванняў. З надыходам халадоў, восенню і зімой, абвастраюцца ўсе запаленчыя працэсы, у прыватнасці ў прастаце (так званы хранічны прастатыт), а таксама ў яечках і іх прыдатках, мочаспускальным канале.

Ёсць пэўная сезоннасць па мочакаменнай хваробе. Апошнія гады мы ўсё часцей адзначаем павышэнне тэмператур летам, на гэтым фоне яшчэ больш парушаецца метабалізм, а мочакаменная хвароба — гэта якраз яго вынік. Пагаршаецца пітны рэжым, нягледзячы на тое, што мы п'ём як звычайна, але мацней пацеем, больш вадкасці выдзяляецца з дыханнем, такім чынам, больш інтэнсіўна адбываецца асяданне солей у ныркех і павелічэнне камянёў. Плюс да ўсяго фрукты і гародніна (а для беларусаў характэрныя аксалатныя камяні) таксама робяць свой «унёсак» па мочакаменнай хваробе. Таму летам і восенню здараюцца абвастрэнні мачакаменнай хваробы.

***— Якія сімптомы павінны насцярожыць мужчыну? З чым нельга зацягваць і трэба адразу звяртацца да ўролага?***

— Самая галоўная ахоўная рэакцыя арганізма — праяўленне болю. Таму пры любых болевых адчуваннях у зоне мочапалавых органаў, варта задумацца, ад чаго гэта адбываецца. Яшчэ адна важная праява — любое парушэнне мочаспускання: ускладненне, пачашчэнне, дыскамфорт падчас ці пасля. І, натуральна, нехарактэрныя выдзяленні з мочапалавых шляхоў, у прыватнасці прымесь крыві ды мачы. Вось гэта павінна прымусіць мужчыну ў найбліжэйшы час звярнуцца да ўрача, бо кроў у мачы часта з'яўляецца самым першым сімптомам уралагічнай анкапаталогіі.

***— Калі ўжо мы закранулі гэту тэму, то рак прастаты ў мужчын — на адным з першых месцаў у структуры анкалагічных хвароб. У якім узросце варта правярацца і якія аналізы здаваць?***

— Так, рак прастаты займае адно з лідзіруючых месцаў не толькі ў нас, але і па ўсім свеце. У нашай краіне працуе праграма скрынінгу раку прастаты, якая ўключае тры пункты. Пачынаем з аналізу крыві на ПСА (прастатаспецыфічны антыген), далей пальцавае рэктальнае даследаванне і ўльтрагукавое (УГД). Дарэчы, да пальцавага рэктальнага даследавання ў многіх спецыялістаў цяпер крыху скептычнае стаўленне, ды і пацыенты не заўсёды яго ўспрымаюць станоўча. Сёння маецца сучаснае абсталяванне — рэктальныя датчыкі з магчымасцю выканання эластаграфіі (спецыяльная праграма ў сучасных УГД-апаратах, якая дазваляе ацаніць шчыльнасць тканкі). Пры выкананні кваліфікаваным спецыялістам гэта больш інфарматыўна. Ёсць МРТ — выдатнае абсталяванне і праграмы, якія дазваляюць убачыць усё. Тым не менш гэты этап скрынінгу ніхто не адмяняў.

Падчас дыягностыкі пацыентаў дагэтуль робяць шмат памылак. У прыватнасці, вызначаны строгія крытэрыі: па праграме скрынінгу раку прастаты праходзяць усе мужчыны з 45 гадоў пры адсутнасці анкаўралагічнага анамнезу (калі ў бацькі, дзеда, роднага брата не было раку прастаты). Калі анамнез абцяжараны, то крыху раней. На практыцы даводзіцца сутыкацца з выпадкамі, калі малады мужчына ў 25 гадоў здае аналіз ПСА — выраšыў цалкам праверыцца і прызначыў сабе аналізы. Натуральна, што аналіз выконвае аўтамат, які працуе па праграме для мужчын ад 40—45 гадоў, ён не настроены на паказчыкі 25-гадовага чалавека. У выніку пацыент бачыць, што ў яго не норма, бо лабараторны бланк выдзелены асобнай пазнакай, і са страхам бяжыць да ўрача. Даводзіцца тлумачыць, што ў такім узросце здаваць гэты аналіз немэтазгодна.

Акрамя таго, ёсць дакладныя крытэрыі падрыхтоўкі да здачы аналізу крыві на ПСА. Мінімум пяць дзён не мець сексуальных адносін, не ўжываць моцнага алкаголю, утрымлівацца ад язды на веласіпедзе і заняткаў на велатрэнажоры, перад здачай на ПСА не праходзіць ва ўрача пальцавае рэктальнае даследаванне — каб не было механічнага ўздзеяння на зону прастаты. У адваротным выпадку таксама можна атрымаць шакавальныя паказчыкі гэтага аналізу.

Яшчэ адна важная акалічнасць — пацыент павінен здаваць гэты аналіз на фоне адноснага здароўя і стабільнага стану. Зразумела, што ў 60 гадоў ёсць хранічныя хваробы, але яны павінны быць не ў абвостраным стане. З вострым захворваннем — кашлем, ковідный пнеўманіяй, тэмпературай ні ў якім разе нельга здаваць гэты аналіз. Нават калі ўрач парэкамендаваў вам яго зрабіць, дачакайцеся выздараўлення. Такім чынам, вы адсякаеце шэраг памылак, непатрэбных візітаў да доктара і зберажаце свае час і нервы.

### СЯДЗЯЧАЯ ПРАЦА — ВОРАГ МУЖЧЫНСКАГА ЗДАРОЎЯ

***— Якія мужчынскія захворванні самыя распаўсюджаныя? З чым найчасцей звяртаюцца да ўролага?***

— У амбулаторнай практыцы гэта, канешне, захворванні, звязаныя з запаленчымі працэсамі. Але дакладна заўважная тэндэнцыя да росту праблем прастаты, яны маладзеюць. Таксама актуальныя праблемы эрэктыльнай дысфункцыі і мужчынскага бясплоддзя. Аналізуючы навуковыя артыкулы, прыходзіш да высновы, што гэта даніна ўрбанізацыі і сучаснаму жыццю. З аўтамабіля — у офіс, з офіса — у аўтамабіль, з аўтамабіля — на канапу. Пры пастаянным сядзенні па восем гадзін за камп'ютарам можна хоць кожны дзень хадзіць на бегавую дарожку, але ад застою крыві ў тазавых органах гэта не пазбавіць. Пагаршаюцца працэсы абмену рэчываў, у тым ліку і ў мочапалавой сістэме.

Сёння ўвогуле бактэрыяльныя прастаты сыходзяць на другі план, больш стала тых, што звязаны з застойнымі з'явамі. У іх класічныя клінічныя праявы, на УГД ускосныя прыкметы застою ў прастаце, а аналізы добрыя: няма ні бактэрый, ні вірусаў, ні іншых мікробных агентаў. Такое, на жаль, часта сустракаецца, у тым ліку ў моладзі.

***— Што можна параіць тым мужчынам, у каго сядзячая праца?***

— Некаторым мае калегі рэкамендуюць кожную гадзіну па 10 прысяданняў. Аднак не кожнаму гэта падыдзе, асабліва калі мужчына не прывык фізічна напружвацца. У любым выпадку гэта мусіць быць рух. Вельмі карысны басейн. Таксама я рэкамендую перыядычныя курсы венатонікаў, якія паляпшаюць вянозны адток, і комплексныя раслінныя прэпараты, што паскараюць абмен рэчываў у прастаце, палавых органах.

Праблемы кагнестыўных (застойных) прастатытаў, эрэктыльнай дысфункцыі і мужчынскага бясплоддзя, дарэчы, узаемазвязаны. Калі дрэнны кровазварот, пакутуе работа прастаты і мужчынскіх палавых органаў, натуральна, гэта будзе ўплываць і на эрэктыльную дысфункцыю, і на спермаграму. Дарэчы, ковід абвастрае многія захворванні ў арганізме, у тым ліку ўплывае на спермаграму. Апошнім часам даводзіцца гэта назіраць у пацыентаў.

***— Якія новыя тэхналогіі сёння дазваляюць эфектыўна лячыць мужчынскія захворванні?***

— Выдатны метад — лакальная ўдарна-хвалевая тэрапія. Першапачаткова яна пазіцыянавалася для дыстанцыйнага драблення камянёў. Цяпер створана абсталяванне, якое дазваляе праводзіць кропкавую ўдарна-хвалевую тэрапію на вобласці пахвіны і прамежнасці. Гэта эфектыўна дапамагае і пры прастатытах, і пры хваробе Пейроні, калі ў абалонках кавернозных целаў палавога члена без усялякай прычыны ці пасля траўм утвараюцца бляшкі, якія прыводзяць да парушэння эрэкцыі і болевага сіндрому. Метад дазваляе пазбавіцца ад непрыемных адчуванняў, боляў, сіндрому хранічнага тазавага болю, садзейнічае ангіягенезу — прарастанню новых сасудаў. Зараз ва ўралогію прыйшла высокаінтэнсіўная лазерная тэрапія — HILT. Яна таксама дае добры эфект і для абязбольвання, і для паляпшэння кровазвароту і прарастання новых сасудаў.

***— Ці можна такім чынам палепшыць патэнцыю?***

— Калі з гарманальным статусам мужчыны і агульным станам здароўя ўсё добра, гэтыя метадыкі вельмі эфектыўныя.

### ЧАСТЫЯ ЦЫСТЫТЫ ВЯДУЦЬ ДА ПРАДРАКУ

***— Ці звяртаюцца да ўролага жанчыны?***

— Жанчыны, хоць і менш за мужчын, але таксама хварэюць на мочакаменную хваробу. А праблемай жаночых цыстытаў і лейкаплакіі мачавога пузыра я займаюся больш за 20 гадоў.

***— Раскажыце, што гэта за захворванне — лейкаплакія мачавога пузыра?***

— Раней яно дакладна градзіравалася як факультатыўны прадрак. Ёсць аблігатны прадрак, на фоне якога рана ці позна абавязкова разаўецца рак, а з факультатыўнага можа і не развіцца, але верагоднасць большая, чым пры нязмяненай слізістай.

Лейкаплакія мачавога пузыра — гэта хранічнае захворванне слізістай мачавога пузыра, пры якім адбываецца замяшчэнне ўчасткаў эпітэлію агрубелымі лускавінкамі. Значна часцей яно дыягнастуецца ў жанчын, чым у мужчын. Выяўляюць яго прыкладна ў 60 % жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту і ў 90 % — пры хранічных рэцыдыўных цыстытах. Прычым спачатку хранічны цыстыт правакуе ўзнікненне лейкаплакіі, а затым ужо яна сама падтрымлівае хранічнае запаленне ў мачавым пузыры. Развіваецца так званае замкнёнае кола, разарваць якое толькі прыёмам антыбіётыкаў, на жаль, не атрымліваецца.

Апошнім часам вельмі дакладна прасочваецца заканамернасць спадарожніцтва эрозіі шыйкі маткі і лейкаплакіі мачавога пузыра. Эрозію або дысплазію шыйкі маткі выклікае вірус папіломы чалавека. Дастаткова распаўсюджанае захворванне, і з часам яго колькасць павялічваецца. Растлумачыць гэта можна зніжэннем агульнага імунітэту папуляцыі.

Я разумею, як няпроста даводзіцца жанчынам з хранічным цыстытам, а прыходзяць пацыенткі, у якіх у анамнезе такая праблема восем — дзесяць гадоў. Калі абвастрэнне цыстыту здараецца тры разы за год і болей, гэта паказанне да цыстаскапіі (абследавання мачавога пузыра з дапамогай эндаскопа, што дазваляе пагледзець яго стан знутры), бо слізістая перастала выконваць сваю бар'ерную функцыю і стала слабым звяном арганізма.

***— Акрамя частых цыстытаў, ці ёсць яшчэ якія-небудзь праявы гэтай хваробы?***

— Толькі ўскосныя. Дыскамфорт у канцы і пасля мочаспускання, які кожны вызначае па-рознаму: казытанне, боль, рэзі, паколванне. Нават падчас рэмісіі цыстыту пацыенткі скардзяцца на дыскамфорт пасля мочаспускання. Але дакладна наяўнасць хваробы вызначыць можа цыстаскапія. На жаль, пры ўсіх сучасных тэхналогіях, 3D-апаратах, КТ і МРТ, тонкія змяненні слізістай мачавога пузыра выяўляюцца толькі пры цыстаскапіі. Прычым мэтазгодна яе праводзіць з відэафіксацыяй, бо гэта дае магчымасць пацыентцы пачуць меркаванне іншага доктара, параўнаць «да» і «пасля» аперацыі, мінімізаваць чалавечы фактар.

***— Лейкаплакія — незваротны стан? Змененая слізістая не можа вярнуцца да нормы?***

— Калі развіліся сур'ёзныя змяненні слізістай, такія як лейкаплакія, на жаль, ніякімі ўколамі ці таблеткамі працэс адматаць назад нельга. Адзіны спосаб радыкальнага лячэння — аперацыя. Яе сутнасць адна, які б метад ні выкарыстоўваўся, — выдаліць змененую слізістую, на месцы якой вырасце новая і будзе выконваць сваю бар'ерную функцыю.

Выдаленне або каагуляцыя выконваецца пад агульным наркозам двума спосабамі — электракаагуляцыя і лазерная каагуляцыя. У лазернай недахопаў няшмат: кошт, абмежаваная колькасць клінік, дзе ёсць такое абсталяванне і, адпаведна, спецыялістаў, якія ўмеюць на ім працаваць. Усё астатняе — толькі перавагі. Шырыня пятлі пры электракаагуляцыі — 6-7 мм, адпаведна, інструмент, які праводзіць яе праз урэтру і мочаспускальны канал, павінен быць яшчэ большы. Таўшчыня лазернага святлавода — шарык шарыкавай ручкі. Дакладнасць апрацоўкі 6-7 міліметровай пятлёй адпаведна меншая, чым больш тонкім інструментам. Пасля лазернай каагуляцыі, у адрозненне ад электракаагуляцыі, у слізістай прарастаюць новыя сасуды, а гэта жыўленне тканак. Калі слізістая добра сілкуецца, яна лепш выконвае сваю бар'ерную функцыю. Да таго ж пры лазернай каагуляцыі хутчэй і лягчэй адбываюцца працэсы зажыўлення — ужо на наступны дзень нармалізуецца мочаспусканне і знікаюць непрыемныя праявы хваробы.

***— Вы згадвалі, што гэта захворванне жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту...***

— Сярод пацыентак ёсць дзяўчаты, якія не жывуць палавым жыццём, і ёсць жанчыны ў постменапаўзе, але часцей за ўсё гэта 20—35 гадоў.

***— Як папярэдзіць развіццё лейкаплакіі?***

— Правільна лячыць цыстыт. Нярэдка жанчыны з ім увогуле не ідуць да ўрача. Выпіла дзве таблеткі, тым больш што яны безрэцэптурныя, стала лепш, і на гэтым усё. Такім «лячэннем» мікробы толькі прыглушаюцца да наступнага разу. І адаптуюцца — перастаюць быць адчувальнымі да такіх прэпаратаў. Таму лячыць цыстыт варта пад кантролем урача.

# НАВЕДАЦЬ «ГЛУШЦОВАЕ ТАКАВІШЧА» І ДАКРАНУЦЦА ДА ЗОРАК,

## або Што прапаноўваюць на Магілёўшчыне для гасцей



**Міністэрства інфармацыі і Магілёўскі аблвыканкам арганізавалі для журналістаў рэспубліканскіх і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі прэс-тур па аб'ектах настальгічнага турызму Магілёўшчыны. Калісьці я працавала ў адным з выданняў рэгіёна, даводзілася ездзіць у камандзіроўкі, наведваць установы культуры, сацыяльна-эканамічнага прызначэння. Таму адначасова прыемна і шчымліва было вярнуцца туды, дзе прайшло некалькі найлепшых гадоў жыцця. Бясспрэчна, у вобласці з таго часу з'явілася шмат новых цікавых аб'ектаў. Уразіў і сам Магілёў — чысты, добраўпарадкаваны, утульны, камфортны для жыцця, а яшчэ тое, як беражліва і паважліва магіляўчане ставяцца да мінулага свайго краю, традыцый продкаў.**

Першы прыпынак у сядзібе «Глушцовае такавішча», якая належыць Бялыніцкаму лясгасу. Тэрыторыя паляўнічых угоддзяў тут больш як 114 тысяч гектараў. Знаходзіцца гаспадарка ў маляўнічых мясцінах, дзе працякаюць рэкі Друць, Вословка, Няропля, налічваецца некалькі азёр. Вядома, тутэйшыя лясы багатыя на парнакапытных. Паляваць на іх усім ахвотным дапамагаюць высокапрафесійныя егеры. Але ў «Глушцовым такавішчы» можна і выдатна адпачыць, правесці сямейныя і карпаратыўныя мерапрыемствы. Для гэтага створаны ўсе ўмовы. Да паслуг наведвальнікаў — гасцявы домік на 10 спальных месцаў, пяць пакояў адпачынку, банкетная і більярдная залы, танцпляцоўка, возера, лазня, альтанкі з мангаламі.

### ДЗІВОСНЫ СВЕТ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Бялынічы вядомыя беларусам тым, што тут знаходзіцца мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі. Летась установа стала філіялам Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава.

Заснаваны музей Бялыніцкага-Бірулі ў 1969 годзе, першых наведвальнікаў прыняў у 1970-м. Дапамогу ў яго арганізацыі і адкрыцці аказалі заслужаны дзеяч мастацтваў, першы дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі Алена Васілеўна Аладава і жонка мастака Алена Аляксееўна Біруля.

У мінулым годзе ў сувязі са святам Дня беларускага пісьменства, якое сустракалі Бялынічы, адкрыты новы прасторны будынак музея. Экспазіцыя знаёміць з гісторыяй бялыніцкага краю і з работамі мастака, якія захоўваюцца на Магілёўшчыне. У трох вітрынах прадстаўлены асабістыя рэчы творцы, перавезеныя са знакамітай дачы «Чайка». Вітольд Каэтанавіч нарадзіўся 12 лютага 1872 года ў фальварку Крынкі Бялыніцкага раёна. Але так склаўся лёс, што ён пераехаў у Расію. У 1912-м набыў участак зямлі ў Цвярской губерні на беразе возера Удомля, непадалёк ад тых мясцін, дзе працаваў Левітан, пабудаваў дом з майстэрняй. Сваю сядзібу ён назваў «Чайка», з ёй звязана большая частка жыцця і творчасці майстра. У фондах музея — 27 арыгінальных работ Бялыніцкага-Бірулі

Гэтыя палотны вельмі добра адлюстроўваюць дзівосны свет бялыніцкай і наогул беларускай зямлі. Творца не пісаў парадных партрэтаў. Усё жыццё займаўся пейзажамі. Як сцвярджаюць мастацтвазнаўцы, эмацыянальныя, змястоўныя творы гэтага мастака вызначаюцца мяккім сярэбранабэзавым і зеленаватым колерамі. Гэта беларускі каларыт, паколькі творчая манера Бялыніцкага-Бірулі адпавядае асаблівасцям нашай прыроды.

### СПАЛУЧЭННЕ ЭПОХ І АРХІТЭКТУР

Правялі нас экскурсаводы і па пешаходным маршруце «Стары горад» (Магілёў), які ў многіх удзельнікаў тура таксама абудзіў настальгічныя пачуцці. Тут праходзілі прадстаўнікі розных краін і розных нацыянальнасцяў, веравызнанняў — рускія, яўрэі, палякі. Калісьці Магілёў быў шматнацыянальным і шматканфесійным горадам. Напрыклад, у настальгічны тур прыязджаў разам з сынам аўстраліец Лях Нявінскі. Менавіта ў Магілёве прайшло яго дзяцінства. У 2018 годзе тут прымалі групу ізраільцян, якія раней жылі ў горадзе.





Яго адметнасць — пешаходная вуліца Ленінская, адна з самых старых, якая вядомая з XVI стагоддзя. Яна пачынаецца ад плошчы Славы і заканчваецца ў раёне вуліцы Міронава. Такой працяглай пешаходнай вуліцы няма больш нідзе ў Беларусі — яе працяг без нечага паўтара кіламетра. Вуліца некалькі разоў мяняла назву — Ветраная, Вялікая Садовая, Інжынерная. Цяперашнюю назву яна атрымала ў 1919 годзе, а пешаходнай стала ў 2004-м. Тут, як ні ў якім іншым горадзе, спалучаюцца розныя эпохі і архітэктуры. На Ленінскай, 7 знаходзіцца адзін з найстарэйшых будынкаў, узведзены ў стылі класіцызму ў 1790 годзе. Гэта тэрыторыя былога архіерэйскага двара ў XVII-XVIII стагоддзях, дзе пражываў свяціцель Георгій Каніскі. На Ленінскай, 25 размяшчалася рэзідэнцыя епіскапа Богуша Сестранцэвіча. Сёння ў гэтым гістарычным будынку спартыўная школа. На Ленінскай, 37 — філіял Нацыянальнага музея жывапісу, прысвечанага творчасці Бялыніцкага-Бірулі. Будынак — прыклад архітэктуры ў стылі барока. У гэтым будынку аўстрыйскі кароль Іосіф II сустракаўся з расійскай імператрыцай Кацярынай II.

Упрыгожвае гістарычны цэнтр горада і плошча Зорак, якая была ўладкаваная ў 2004 годзе. У цэнтры кампазіцыі — скульптура сяміметровага «Астранома», што глядзіць у чатырохметровы тэлескоп. Вакол 12 крэслаў — па ліку знакаў задыяка. Аўтар праекта — вядомы скульптар Уладзімір Жбанаў.

Некаторыя жыхары горада лічаць, што Жбанаў, перш чым узяцца за работу, раіўся з астролагамі. Іншыя вераць, што калі пасядзець у крэсле свайго знака, спраўдзіцца любое жаданне. Трэція сцвярджаюць: калі дакрануцца да пальца астранома, то пашчасціць у жыцці. Дарэчы, такога ўнікальнага ансамбля няма нідзе ў свеце. Акрамя таго, гэтая кампазіцыя служыць і сонечным гадзіннікам.

Адначасова плошча з'яўляецца «Алеяй славы». Менавіта тут на выбітых на бетонных плітах зорках значацца імёны людзей, якія ўнеслі вялікі ўклад у эканамічнае, сацыяльнае, культурнае развіццё Магілёўшчыны.

### «РАДЗІМУ» НЕ ЗДАЮЦЬ

Насупраць плошчы Зорак месціцца яшчэ адзін цікавы і дарагі кожнаму магіляўчаніну аб'ект — кінатэатр «Радзіма», які хацелі знесці, але гараджане адстаялі знакавы будынак. Яго будаўніцтва пачалося ў 1938 годзе, а ўжо 6 кастрычніка 1939-га адбылося ўрачыстае адкрыццё. Кінатэатр працягваў працаваць нават у пачатку Вялікай Айчыннай вайны і да канца ліпеня 1941 года. Для байцоў Чырвонай Арміі тут дэманстраваўся фільм «Хлопец з тайгі», (СССР, 1941). Сеанс не прыпыняўся нават падчас налётаў варожай авіяцыі. Пасля вайны адным з першых магіляўчане ўбачылі фільм «Яна абараняе Радзіму». Будынак кінатэатра захаваў першапачатковы архітэктурны выгляд. А вось унутраныя памяшканні неаднаразова рамантаваліся, перапланіраваліся. Сёння кінатэатр аснашчаны ўсім неабходным сучасным абсталяваннем, а з 2011 года дэманстрацыя фільмаў ідзе ў 3D-фармаце.

### ТУТ ЖЫВЕ МЕЛЬПАМЕНА

Магілёўскі абласны драматычны тэатр — шыкоўны будынак з вежамі. Асаблівасць яго ў тым, што глядзельная зала размешчана ў цэнтры, а абапал яе — дапаможныя цэхі, памяшканні. У інтэр'еры шырока выкарыстана разьба па дрэве. Асаблівa яна захапляе ў Губернатарскай (Імператарскай) ложы. У гады Першай сусветнай вайны ў Магілёве знаходзіўся расійскі цар Мікалай II. Ён часта наведваў тэатр, а ложу, якую ён звычайна займаў, назвалі Імператарскай.

Да канца XIX стагоддзя ў Магілёве не было стацыянарнага будынка тэатра. Спектаклі, як правіла, паказваліся ў дамах заможных гараджан. У 1870-м у губернатара з'явілася ідэя будаўніцтва культурнай установы. Па яго просьбе магіляўчане пачалі збор сродкаў на яе ўзвядзенне. Удзел у агульнай справе ўзялі не толькі багацеі, але і бедныя, мяшчане, служачыя, студэнты. У 1886-м неабходная сума набралася. Будаўніцтва завяршылі ў 1888 годзе. 14 мая тэатр быў асвячоны, а ў 1889-м адкрыўся першы сезон. У сярэдзіне 1980-х будынак хацелі знесці, а на яго месцы паставіць новы. Аднак супраць гэтага рашуча выступілі гараджане. У 1992-м пачалася яго рэканструкцыя. Тэатр расчыніў дзверы для гледачоў толькі ў 2001 годзе. А ў 2003-м напярэдадні тэатральнага сезона перад галоўным уваходам адкрылі бронзавую скульптуру Уладзіміра Жбанава «Дама з сабачкам».

### ВЕРНУТАЯ СПАДЧЫНА

Магілёўскі кафедральны касцёл Святога Станіслава — помнік архітэктуры барока. Будаваўся з 1738-га да 1752 года. Паводле легенды, ён узведзены на месцы драўлянага касцёла кармелітаў Унебаўзяцца Найсвяцейшай Дзевы Марыі. У канцы XVIII стагоддзя быў рэканструяваны ў стылі класіцызму і атрымаў назву ў гонар Святога Станіслава. Храм закрылі ў 1956 годзе і размясцілі тут Цэнтральны гістарычны архіў БССР, а затым пасля яго пераводу ў Мінск — Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. На той час унутры храм быў замаляваны зялёнай фарбай. У 1990-х касцёл вярнулі вернікам, якія адмывалі і адчышчалі фарбу. Але частка ўнікальных аўтэнтычных фрэсак другой паловы XVIII стагоддзя на біблейскія сюжэты была страчана. Знік і рэдкі арган. Такіх у свеце было толькі чатыры, у тым ліку ў Рыме, Варшаве і Мехіка.

Яшчэ адным выдатным месцам Магілёва з'яўляецца плошча Славы, якая ўзнікла ў першай палове XVI стагоддзя і называлася Гандлёвай. Тут размяшчаліся 26 гандлёвых лавак. Пасля далучэння горада да Расійскай імперыі яе перайменавалі ў Губернатарскую і забудавалі комплексам устаноў. На жаль, пасля Вялікай Айчыннай вайны з усяго гэтага ансамбля апошняй трэці XVIII стагоддзя захаваўся будынак былога акруговага суда. Цяпер тут знаходзіцца Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. У 1982-м на плошчы Славы адкрыты мемарыяльны комплекс «Барацьбітам за савецкую ўладу».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
*Магілёўская вобласць.*



Фота sb.by

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Открой мир привилегий ДЛЯ СЕБЯ!»

**Сведения о рекламной игре:**
Наименование рекламной игры: «Открой мир привилегий ДЛЯ СЕБЯ!»
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 1 июля 2021 г. по 22 октября 2021 г.
В рекламной игре приняли участие 20 участников.
Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Обладателем 1 (одного) приза «Сертификат на отдых в санатории Альфа Радон: размещение в санатории Альфа Радон на 7 ночей на двух человек, тип размещения: номер для размещения STANDARD – двухместный номер с балконом для двух взрослых, тип питания – шведский стол, услуги по оздоровлению, курортный сбор. Срок действия Сертификата – до 30 сентября 2022 года включительно и денежные средства в размере 575,29 (пятьсот семьдесят пять белорусских рублей 29 копеек)» стал Юзифович Семён Анатольевич.

Обладателем 1 (одного) приза «Денежный приз на 2500 белорусских рублей и денежные средства в размере 351,15 (триста пятьдесят один белорусский рубль 15 копеек)» стала Ивашкевич Наталья Леонидовна.

Обладателем 1 (одного) приза «Денежный приз на 1500 белорусских рублей и денежные средства в размере 201,72 (двести один белорусский рубль 72 копейки)» стала Хамитова Эльмира Маратовна.

Обладателем 1 (одного) приза «Денежный приз на 1000 белорусских рублей и денежные средства в размере 127,01 (сто двадцать семь белорусских рублей 1 копейка)» стала Бубен Алла Сергеевна.

Организатором рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМО-ИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4026 от 16.06.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры: 8 (017) 229 99 99, 8 (029) 509 99 99, 8 (044) 509 99 99, 8 (025) 509 99 99 круглосуточно.

Сайт https://mtbank.by/promotions_live/game-visa-gold.

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 120 от 26.06.2021.

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
## ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лахвича Василия Адамовича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **20 октября 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Где находится | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6089 ЕК-3, 2010 г. в. | 1 | 21876,6 |
| 2 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в. | 1 | 22223,16 |
| 3 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 5460-3 ЕК | 1 | 29925 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в. | 1 | 25001,06 |
| 5 | Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в. | 1 | 6944,738 |
| 6 | МАЗ-5551 «Самосвал», гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в. | 1 | 5861,88 |
| 7 | Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № AI 3858-3, 1990 г. в. | 1 | 3958,365 |
| 8 | Автомашина «УРАЛ 4320-3», гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в. | 1 | 8526,06 |
| 9 | Автомобиль УАЗ*390945*330№ двиг.409100*В3044904, № шасси 330360В0459912, гос. № AI 1144-3, 2010 г. в. | 1 | 4796,55 |
| 10 | Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в. | 1 | 4263,03 |
| 11 | Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет) | 1 | 1894,68 |
| 12 | Газ 53 Автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в. | 1 | 7628,58 |
| 13 | Автомобиль УАЗ-452, гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в. | 1 | 3375,35 |
| 14 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 1663-3 АМ, двиг. № 409110*Н3036855, VIN:XTT 390995J202995, 2017 г. в. | 1 | 11806,51 |
| 15 | МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в. | 1 | 7105,05 |
| 16 | Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в. | 1 | 2131,52 |
| 17 | Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260 | 2 | 3730,37 |
| 18 | Грузовой бортовой ГАЗ-66-12, гос. № 4033-3 АМ, ш. 0456045, дв. 109082, 1986 г. в. | 1 | 6513,39 |
| 19 | Автомобиль «Урал-375», гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет) | 1 | 5343,70 |
| 20 | Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231 | 2 | 10658,53 |
| 21 | Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233 | 2 | 10125,15 |
| 22 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500 люб. вращения ХВ, инв. № 238 | 2 | 1687,675 |
| 23 | Пилорама РПМ-02-К б/у, инв. № 397 | 2 | 3937,608 |
| 24 | Станок строгальный 4-сторон., инв. № 45 Т | 2 | 5625,283 |
| 25 | Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т | 2 | 675,07 |
| 26 | Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т | 2 | 1125,418 |
| 27 | Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514 | 2 | 5343,703 |
| 28 | Станок брусовочный двухвальный | 1 | 10658,43 |
| 29 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565 | 2 | 1125,418 |
| 30 | Молот пневматический, инв. № 000885 | 1 | 2664,59 |
| 31 | Мотопомпа, инв. № 001427 | 1 | 1262,18 |
| 32 | Гидроманипулятор ОМТЛ-97, инв. № 262 | 1 | 3029,40 |
| 33 | Станок мод. В3-367 точильно-шлифовальный, металлореж., инв. № 36 | 1 | 374,54 |
| 34 | Заточной станок Б/У, инв. № 68 | 1 | 132,05 |
| 35 | Пост для ремонта легковых автомобилей, инв. № 001666 | 1 | 1332,09 |
| 36 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/1, инв. № 486 | 1 | 337,54 |
| 37 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04 № 0407-3 АМ, 2017 г. в. | 1 | 11626,20 |
| 38 | Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами не приводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563 | 1 | 4986,36 |
| 39 | Бензопила MS361 № 183864091 | 1 | 393,775 |
| 40 | Бензопила MS361 № 172157104 | 1 | 393,775 |

**Местонахождение:**
**1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,**
**2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск.**
**Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 07.10.2021 г. с 09.00 по 19.10.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2021 г.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «СлавМол», Гомельская обл., Гомельский р-н, Азделинский с/с, аг. Азделино, ул. Новая, д. 3** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
Адрес – **Гомельская обл., Гомельский р-н, Тереничский с/с, 5, ПЛОЩАДКА ДЛЯ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ МАШИН, вблизи п. Калиновка**

**Площадка для сельскохозяйственных машин** (сооружение специализир. автомоб. транспорта и автодорож. хозяйства), инв. номер 310/С-68474, общая площадь 20032,4 кв. м.
***Сведения о земельном участке***: предоставлен продавцу пл. **6,7076 га** на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания стоянки сельскохоз. машин. Ограничения (обременения) – охранные зоны электрич. сетей (пл. 0,0249 га), расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), – пл. 2,8087 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 271 578,99 бел. руб.**
(снижена на 30 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

По письменному заявлению Покупателя (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) может быть предоставлена рассрочка оплаты с ежемесячной индексацией платежей, исходя из индексов цен производителей промыш. продукции производственно-технич. назначения, но не более 12 месяцев. Право собственности на объект переходит Покупателю после полной оплаты его стоимости

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.08.2021 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 21.10.2021 г. в 13.00.** **Окончание торгов: 21.10.2021 г. в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.10.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны:**
**+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

# Извещение об открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 9 ноября 2021 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Гродненская область, г. Гродно, ул. Ланского, 23 (У-22к, микрорайон «Южный-4») 440100000003004361 | 0,1212 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 35 %. Фундамент: бетон; стены: блоки газосиликатные, кирпичи; площадь застройки: 173 кв. м; общая площадь 143,60 кв. м | 232,54 | 50 125,44 (20 189,04; 29 936,40) | 10 000 |

** Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 9 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 11 октября по 3 ноября 2021 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by.

# Сустрэліся жаночыя лідары

**Круглы стол «Сацыяльная палітыка Саюзнай дзяржавы» прайшоў у гарадской ратушы нашай сталіцы. У ім узялі ўдзел актывісткі Беларускага саюза жанчын і рэгіянальнага аддзялення Агульнарасійскай грамадска-дзяржаўнай арганізацыі «Саюз жанчын Расіі» — «Жаночы альянс».**


Фота БелТА.

— Мы сабраліся, каб абмеркаваць надзённыя пытанні нашага супрацоўніцтва, — сказала **першы намеснік міністра аховы здароўя, старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН.** — А гэта напрамкі сацыяльнага ўзаемадзеяння і развіцця нашых дзяржаў, накіраванасць на кожнага чалавека, на забеспячэнне мер сацыяльнай падтрымкі сем'яў, у тым ліку маладых, а таксама адзінокіх і пажылых людзей.

Беларускім саюзам жанчын і Саюзам жанчын Расіі было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. **Старшыня Санкт-Пецярбургскага рэгіянальнага аддзялення агульнарасійскай грамадска-дзяржаўнай арганізацыі «Саюз жанчын Расіі» — «Жаночы альянс» Алёна КАЛІНІНА** адзначыла, што жанчыны дзвюх краін выступаюць за тое, каб будучыня дзяцей, дзяржаў, народаў была стабільная і прадказальная, каб дабрабыт сем'яў толькі ўзрастаў.

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** раней, у прывітальным слове да ўдзельніц круглага стала, які праходзіў у Мірскім замку, адзначыў, што Беларускі саюз жанчын і Саюз жанчын Расіі з'яўляюцца аднымі з найбольш значных інстытутаў грамадзянскай супольнасці дзвюх краін. Аб'яднанні займаюцца пытаннямі дэмаграфічнай бяспекі, абаронай мацярынства і дзяцінства, традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, рэалізуюць перспектыўныя праекты, накіраваныя на павышэнне грамадскага статусу, прафесійнай і сацыяльнай актыўнасці жанчын і іх ролі ў палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці краін.

Дзмітрый Мезенцаў падкрэсліў, што падобныя сустрэчы ўзбагачаюць расійска-беларускія сувязі і садзейнічаюць умацаванню дружбы паміж Беларуссю і Расіяй.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Кінафорум

# БЫЦЬ ЧАЛАВЕКАМ — МІСІЯ НА ЎСЕ ЧАСЫ



**Фільм «Баявы разлік 41-га».**

**Актуальныя тэмы, аўтарскі падыход і спроба сказаць пра важнае за чатыры хвіліны — такімі запомняцца два дні VI Фестывалю дакументальнага кіно «Еўразія. DOC» у беларускай сталіцы. Праводзіўся ён традыцыйна на два гарады: пачаўся 27 верасня ў Смаленску, а завяршыўся ўжо ў Мінску.**

Перад стартам кінапаказаў арганізатары і прадстаўнікі журы сустрэліся з журналістамі, дзе падзяліліся ўражаннямі, адзначалі тэндэнцыі кінафоруму, распавядалі пра навуўвядзенні. У прыватнасці, **старшыня журы фестывалю «Еўразія. DOC» Віталь ТРАЦЦЯКОЎ** адзначыў, што сярод недахопаў можна вылучыць зацягнутасць некаторых работ, нюансы, якія звязаны з тэматычнай карцін: «З году ў год мы глядзім фільмы пра пустэльнікаў. Але чым яны прыкметныя, незразумела. Хочацца ад такога чалавека пачуць нейкае адкрыццё. Ён жа на зоркі глядзіць, з Богам размаўляе. Аднак нічога такога не чую. Тады навошта вы мяне, гледача, прывялі да гэтага героя?» Ёсць, на думку мэтра, і здабыткі: правільна раскрываецца ваенная тэматыка, «калі і Нюрнбергскі працэс, і пачатак вайны, і іншыя падзеі паказаны без пафасу, а праз драму».

Нагадаем, у гэтым годзе арганізатары атрымалі амаль 200 фільмаў-заявак з 21 краіны на ўдзел у кінафестывалі. Але ў канчатковую праграму, якую аўдыторыі дэманстравалі на працягу пяці дзён, увайшло толькі 30 фільмаў з 10 краін, сярод якіх Беларусь, Расія, Арменія, Узбекістан, Латвія, Азербайджан і іншыя.

## «А ПОТЫМ МЫ ПЛАКАЦЬ ПЕРАСТАЛІ...»

Ці то пандэмія адбіваецца, ці то не самы зручны час сеансаў і тое, што фільмы паказваюць у дзвюх кіназалах паралельна, але нешматлікасць аўдыторыі, якую гэтымі днямі даводзілася назіраць на паказах у кінатэатры «Беларусь», здзіўляла, бо змест кінастужак сапраўды варты ўвагі. Напрыклад, у першы дзень я паглядзела тры работы, і кожная з іх па-свойму кранула і падштурхнула да роздумаў...

Дакументальны фільм «Фабзайцы» рэжысёра Марыі Смялковай (Расія) — прапанова згадаць пра той час, калі ў 1940-м з Мінска ў Ленінград паехалі вучыцца ў школы і вучылішчы рамёстваў ФЗА (фабрычна-завадской адукацыі) каля 24 000 падлеткаў з розных куткоў Беларусі. Кожны з іх марыў пра тое, што вернецца дадому запатрабаваным кваліфікаваным спецыялістам — будаўніком, фрэзероўшчыкам, чыгуначнікам і г. д. Але ўжо ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны вораг захапіў іх радзіму, а пасля і Ленінград знаходзіўся ў блакадным коле. Многія з падлеткаў прыпісвалі сабе год-другі, каб пайсці на фронт. Феадосій Смалячкоў, напрыклад, ураджэнец Магілёўскай вобласці, вучыўся на каменшчыка, а на фронце стаў снайперам. За кароткі час ён знішчыў 125 фашыстаў і навучыў больш за дзясятак чырвонаармейцаў снайперскаму майстэрству. А загінуў хлопец на Пулкаўскіх вышынях. І пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Такіх дзяцей, якія праявілі гераізм, тысячы. «Я быў старастам, часам дзяжурыў ноччу ў інтэрнаце і чуў, як хтосьці плача. Падсядзеш на ложак і супакоіш, каб толькі заснуў. Гэта было ў пачатку вайны. А потым мы плакаць перасталі», — гучаць радкі з лістоў юных беларусаў, на долю якіх выпалі выпрабаванні, невядомасць адносна будучыні. Калі глядзіш у вочы дзяцей на экране, то праўжываеш боль усіх, хто апынуўся на вайне. Палова дзяцей, як на Кіраўскім заводзе, «Арсенале» і іншых прадпрыемствах называлі «зайчанятамі», блакаду не перажыла і назад не вярнулася. І ў 1986 годзе на Піскараўскіх могілках з'явіўся невялікі абеліск у памяць пра іх... Кінастужка па выніках конкурсу была адзначана Спецыяльным прызам прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі ў Мінску.

## ЛЮДЗІ І ЛЁСЫ

А вось Гран-пры (узнагарода сёлета ўручалася ўпершыню) VI фестывалю дакументальных фільмаў «Еўразія. DOC» прысудзілі кінастужцы «Рэанімацыя» (2019) расійскіх рэжысёраў Станіслава Ставінава і Андрэя Цімошчанкі (Расія). Карціна распавядае пра дзіцячага ўрача хуткай дапамогі, які вось ужо 10 гадоў ратуе людзей ад смерці. Яго змены часта доўжацца па некалькі дзён. Ён той, хто суправаджае цяжка параненых пацыентаў, якіх перавозяць у бальніцы на санітарных авіялайнерах, што заўсёды з'яўляецца рызыкоўным... Аднойчы яго свет разбурыўся, і мужчына заўважыў, што глядзіць на крук у столі ў здымнай кватэры. Потым ён пакрыў сваё цела татуіроўкамі... Але гэты чалавек быў першы, хто адрэагаваў на дзве трагедыі, за якімі ўважліва назіралі па ўсім свеце... І працягваў ратаваць іншых... Фільма няма ў адкрытым доступе, аднак зацікаўлены глядач можа знайсці яго на платформах, дзе прагляд магчымы па падпісцы.

У ліку пераможцаў сёлетняга фестывалю аказаліся яшчэ тры расійскія фільмы: «Калі растае снег» Аляксея Галаўкова, «Паратунак у Космасе» Рамана Навалокіна, «Ржэў. 500 дзён у агні» Рамана Гангана, а таксама кінастужка беларускага рэжысёра Аляксандра Ігначкова «Баявы разлік 41-га».

Увогуле, калі гаварыць аб праграме кінафоруму сёлета, то яна атрымалася вельмі разнастайная па тэмах і сюжэтах. Юбілейныя і памятныя даты, пандэмія каранавіруса, Вялікая Айчынная вайна і памяць пра яе, што жыве ў пакаленнях, людзі і іх учынкі рознага маштабу — усё гэта знайшло ўвасабленне ў прадстаўленых гледачу кінаработах. Так, фільм «Латвія. Прывід акупацыі» рэжысёра з Рыгі Андрэя Якаўлева — спроба расказаць гледачу пра канцэпцыю трох акупацый Латвіі Савецкім Саюзам, якая мае месца ў сучаснай палітыцы балтыйскай дзяржавы. Кінастужка змястоўная, але арыентаваная, як адзначыў і сам рэжысёр, на падрыхтаваную аўдыторыю. Яна дае магчымасць кожнаму ўбачыць і пачуць аўтарскую пазіцыю пераасэнсавання гістарычных падзей, а пасля ўжо самім рабіць высновы альбо шукаць факты і будаваць уласную карціну. А вось кінастужка «90-я. Траўма» (Расія) аўтара Арцёма Вараб'я — сапраўдны зрэз таго перыяду, дзе лёсы людзей і іх уменне не страціць сябе даюць добры эмацыянальны пасыл нам, сучасным гледачам, адносна таго, чаго вартая свабода, надзея на заўтрашні дзень, а таксама ўменне быць адданымі сваёй зямлі і не дазволіць ніякім пераменам заглушыць голас сумлення і чалавечнасці. Пасля паказу ў адрас аўтараў кінаработы гучалі папрокі ў «заштампаванасці», але гэта можна ім дараваць. Галоўнае, што ад убачанага на экране глядач часам хоць і жахаецца, але не страчвае надзеі на змены да лепшага. Нешта ў душы адгукаецца, нават калі ты не з таго пакалення.

## ВАЧЫМА МАЛАДЫХ

— Для мяне вялікая радасць быць тут, бо за час пандэміі гэта першы фестываль, на якім я прысутнічаю фізічна. Раней на некалькіх фестывалях я была ў розных якасцях, але... не выходзячы з дому. Прыемна адзначыць, што з кожным годам кінафорум набірае абароты і пашырае свае межы. Тут адкрываюцца новыя імёны, уладальнікі якіх потым уваходзяць у кіно ўжо як мэтры, — адзначыла **член журы з Казахстана Асія БАЙГОЖЫНА.** — Кропкі ўзаемадзеяння і судакранання ёсць на гэтым фестывалі. Пасля прагляду фільмаў прыходзіць усведамленне, чым жывуць людзі. З'явілася тэндэнцыя здымаць патрыятычныя і асветніцкія фільмы. І, што для мяне асабіста важна, дакументальнае кіно паказвае вобразы часу. Але не хапіла карцін, якія б выклікалі палеміку, дэманстравалі яркую пазіцыю іх аўтараў.

Паказаць сябе чарговы раз змаглі і маладыя дакументалісты. У рамках конкурсу «Еўразія.DOC. 4 хвіліны» фіналістамі сталі шэсць работ рэжысёраў з Беларусі, Расіі і Арменіі. А тройку пераможцаў склалі фільмы «Дзверы» аўтараў Хрысціны Даўгалапцевай і Кацярыны Шахаўцовай (Расія), «Час вяртацца дадому» Вольгі Жукавай (Беларусь) і «Нябачны белы халат» Эвеліны Барсегян (Арменія). Трэба сказаць, што кожная з заяўленых работ была моцнай, бо ў чатырох хвілінах маладыя рэжысёры-дакументалісты закранулі тэмы валанцёрства, захавання памяці Вялікай Айчыннай вайны, спроб адраджаць малую радзіму і здзяйсняць свае мары... Як робяць гэта героі фільма «Час вяртацца дадому» — беларусы, што пераязджаюць у вёску, будуюць стайню і становяцца больш блізкімі да прыроды і зямлі, адчуваючы сябе па-сапраўднаму шчаслівымі... Пасля прагляду застаешся нават крыху расчараваным, што паказалі так мала, а думкі своечасовыя і цікавыя. І таму хочацца верыць і спадзявацца, што ў наступным годзе працяг абавязкова будзе!




**Алена ДРАПКО.**
**Фота з сайта eurasiafilm.ru**

Зрабі сябе сама!

## Валерыя ГРАЧАНКОВА:

# «БЕЛАРУСЬ — ГЭТА НАШ АГУЛЬНЫ АГМЕНЬ, ЯКІ МЫ, ЖАНЧЫНЫ, АБЕРАГАЕМ»



**Чатыры гады таму яна змяніла сталічную прапіску на месца жыхарства ў Жодзіне. Менавіта ў гэтым горадзе — радзіме беларускіх волатаў-самазвалаў — кіраўнік Жодзінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Валерыя Грачанкова знайшла сваё прызнанне. Музыкант, якая віртуозна валодае акардэонам, лічыць, што яе справа — прыносіць людзям не толькі радасць і свята, але яшчэ і карысць. Тыя грамадскія ініцыятывы, праекты, культурныя мерапрыемствы, што ствараюцца Валерыяй, вядомыя далёка за межамі рэгіёна. І доказам гэтаму — шматлікія ўзнагароды, занясенне на Дошку гонару, перамогі ў конкурсах, званні «Малады лідар Міншчыны», «Жанчына Міншчыны», «Найлепшы работнік культуры». Аднак званне «Жанчына года — 2020», прысуджанае Беларускім саюзам жанчын, яна лічыць асаблівым.**

***— Валерыя, вы пераможца XIII Рэспубліканскага конкурсу Беларускага саюза жанчын «Жанчына года — 2020» у намінацыі «Духоўнасць і культура». Раскажыце, што гэтаму папярэднічала?***

— Вядома, стаць «Жанчынай года — 2020» у намінацыі «Духоўнасць і культура» — асаблівы гонар і ўзнагарода. Па маёй ініцыятыве і пры маім удзеле было рэалізавана шмат цікавых праектаў у культурным жыцці горада Жодзіна, а таксама шэраг буйных лакальных імпрэз, што былі арганізаваны ў Жодзінскай дзіцячай школе мастацтваў. Напрыклад, праект «Гукі горада» — тыднёвы марафон канцэртаў пад адкрытым небам, які адбыўся ў чэрвені 2018 года. Пры падтрымцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жодзінскага гарвыканкама на пачатку чэрвеня 2019 года прайшла маштабная канцэртная імпрэза — фэст джазавай музыкі Zhodino JAZZ Fest. Гэта быў двухдзённы марафон джазавых калектываў з усёй краіны і блізкага замежжа. Ён праходзіў на пляцоўцы ў нашым гарадскім парку. А 3 ліпеня 2020 года стартаваў праект «Нясумны горад» — цыкл тэлеперадач, якія выходзяць раз на месяц на мясцовым тэлеканале. Праект рэалізоўваецца супольна з усімі ўстановамі культуры нашага горада. Гэта ўсё мае «дзеці», з'яўленнем якіх я вельмі ганаруся! Я імкнуся згуртаваць творчых, ініцыятыўных, крэатыўных, культурных людзей разам, каб зрабіць наша жыццё крыху цікавейшым, а святы — ярчэйшымі!

***— Як гэта ўзнагарода паўплывала на вас, што, магчыма, змяніла, ці з'явіліся новыя праекты, планы, задумкі?***

— Насамрэч, гэтая ўзнагарода ўмацавала веру ў свае сілы, ідэі, працу. Планы? Вядома! У мяне шмат новых ідэй! Не заўсёды хапае часу, каб увасобіць у жыццё ўсе, што задумала! Але я да гэтага імкнуся. Цяпер працую над некалькімі буйнымі задумкамі. Спадзяюся, што хутка змагу паказаць іх гледачам. Планы звычайна не раскрываюць (*усміхаецца*), каб не сапсаваць. Магу сказаць, што гэтыя праекты звязаны з савецкімі фільмамі і з той цудоўнай музыкай, якая гучала ў іх.

***— Раскажыце, як даўно вы з'яўляецеся членам Беларускага саюза жанчын?***

— У Беларускім саюзе жанчын я адносна нядаўна, з 2018 года. Люблю сваю працу, і лічу, што змагу рэалізаваць шмат праектаў, якія зробяць нашых, у тым ліку гарадскіх, выканаўцаў больш папулярнымі і запатрабаванымі. А БСЖ збірае ў сваіх шэрагах менавіта творчых, актыўных і неабыякавых жанчын, якія хочуць змяніць жыццё ў лепшы бок. І змяняюць яго ў шмат якіх кірунках. У тым ліку і ў культуры! Чаму б не?!

**«Я імкнуся згуртаваць творчых, ініцыятыўных, крэатыўных, культурных людзей, каб зрабіць наша жыццё крыху цікавейшым, а святы — ярчэйшымі!»**

***— Валерыя, на ваш погляд як лідара, якая яна, сучасная беларуская жанчына?***

— Сучасная беларуская жанчына — спалучэнне розуму, устойлівасці, спакою з велізарным клопатам пра людзей. Умение аналізаваць падзеі і зменлівае становішча, разумна і разважліва прымаць рашэнні, вучыцца на памылках і рабіць слушныя высновы, рухацца наперад і пры гэтым клапаціцца пра сваю сям'ю, бацькоў, блізкіх і дарагіх людзей, калег, — напэўна, гэта тыя якасці, якія павінны быць уласцівыя сучаснай беларускай жанчыне.



Падчас уручэння граматы ад БСЖ з І. КАРПОВІЧ і Н. СУШКО.

***— Вы аўтар праграмы мясцовага жодзінскага тэлебачання «Нясумны горад»...***

— О... «Нясумны горад» — гэта цэлае асобнае жыццё! Ідэя праекта паўстала пасля некалькіх, не такіх буйных, падобных работ і рэалізавалася да 3 ліпеня 2020 года. Тады і выйшаў першы выпуск «Нясумнага». Перадача выходзіць адзін раз на месяц і складаецца з розных рубрык, якія вядуць настаўнікі, экскурсаводы, кіраўнікі творчых студый і гурткоў, музыканты. У "Нясумным горадзе" мы расказваем пра гісторыю нашага горада, памятныя даты, пра самабытныя народныя святы, якія адзначалі нашы продкі, і традыцыі, якія дайшлі да нашых дзён, пра незвычайныя музычныя калектывы і сучасныя кірункі ў музыцы, асаблівасці жывапісу, камп'ютарнай графікі, мазаікі, лепкі ды іншыя. Таксама ёсць рубрыкі, прысвечаныя моладзі, у якіх мы знаёмім з маладзёжным слэнгам і дапамагаем старэйшаму пакаленню лепш разумець мову сучасных тынэйджараў, разбіраем нюансы этыкету. Мы здымаем адмысловыя відэаролікі, прысвечаныя прафесійным святам ці іншым святочным датам, напрыклад, Дню настаўніка, Дню работніка культуры, Дню інваліда, Дню пажылых людзей, Адзінаму Дню бяспекі Мінскай вобласці і іншым. У гэтай праграме бяруць удзел усе мясцовыя ўстановы культуры. Слоган нашай перадачы — «Усё самае цікавае, самае эксклюзіўнае, самае смачнае і сучаснае тут!» Праект можна паглядзець на YouTube, ёсць суполка «УКантакце» і старонка ў «Аднакласніках». Новым сябрам і падпісантам мы заўсёды рады!

***— Валерыя, а як даўно ў вашым жыцці акардэон?***

— Акардэон з'явіўся ў маім жыцці, як ні дзіўна, выпадкова... Я не планавала займацца музыкай, і тым больш — быць прафесійным выканаўцам! (*Смяецца.*) У вельмі далёкім дзяцінстве мой хросны тата хацеў іграць, і бабуля, сабраўшы апошнія грошы (каштуе ж акардэон нямала), купіла яму інструмент. На жаль, жаданне хроснага хапіла літаральна на некалькі ўрокаў, і з таго часу акардэон шмат гадоў пыліўся на паліцы. Аднак на адным з сямейных свят інструмент апынуўся ў руках хроснага, які з вялікай радасцю паспрабаваў нешта сыграць! Мне вельмі спадабаўся тэмбр інструмента, падаўся нейкім незвычайным, пераліўным. Усе ігралі на фартэпіяна, скрыпцы ці займаліся вакалам. А тут — такое спалучэнне: і клавіятура фартэпіяна, і акампанаваць можна пры спяванні! Вырашыла пайсці ў музычную школу. А потым — канцэрты, конкурсы... Так і засталася ў музыцы.

**«БСЖ збірае ў сваіх шэрагах менавіта творчых, актыўных і неабыякавых жанчын, якія хочуць змяніць жыццё ў лепшы бок».**

***— Для дзяўчыны гэта дастаткова цяжкі музычны інструмент...***

— Акардэоны бываюць розныя. Мой першы інструмент важыў каля сямі кілаграмаў. Потым з'явіўся нямецкі акардэон — каля дзесяці кілаграмаў. Гатова-выбарны, прафесійны канцэртны акардэон важыць каля 20 кілаграмаў. Цяпер я іграю на электронным акардэоне. Яго вага — дзевяць кілаграмаў. Напэўна, трэніроўкі з інструментам на сцэне мяне загартавалі (*смяецца*), і я абавязкова звяртаю ўвагу на вагу! Але ў спартыўную залу ўсё ж трэба! Акардэон — універсальны інструмент. На ім можна іграць і класічную, і народную, і сучасную, і электронную музыку. А як гучыць акардэон у джазе!

***— Падзяліцеся сакрэтамі, як можна захапіць дзяцей гэтым цудоўным інструментам?***

— Я вучыла і вучу дзяцей любіць справу, якой займаешся. Толькі тады можна атрымаць зваротную рэакцыю ад гледача, слухача. Захапіць музыкай немагчыма. Але магчыма ў ёй разабрацца, навучыцца чуць і адчуваць нюансы, разумець кампазітара без слоў і імправізаваць! А вось тут і нараджаецца любоў да мастацтва! Яна «неспадзявана надыдзе...» і, хутчэй за ўсё, застанецца назаўжды!

***— Што самае цяжкае ў педагогіцы, на ваш погляд?***

— Як казаў мой навуковы кіраўнік Аляксандр Іванавіч Кавалёў, «педагогіка — вялікая навука». І навука вельмі перспектыўная, прадукцыйная і цікавая! Для мяне ў працы з дзецьмі самае складанае — гэта, як ні дзіўна, заставацца добрым прыкладам. Дзеці — вялікія парадысты! Яны паўтараюць за намі рухі, фразы, капіруюць манеры. У дзецях бачыш адлюстраванне бацькоў ці настаўнікаў. Дзяцей нават не трэба гэтаму вучыць! У іх гэта закладзена ад прыроды. Часам даводзіцца не вучыць іграць на інструменце, а даваць жыццёвыя парады, і пасля гэтага дзіця зусім па-іншаму глядзіць на твор, на музычны вобраз. Таму імкнешся перадаць ім добры прыклад у музыцы, у паводзінах, у жыцці ў цэлым.

***— Ведаю, што сёлета вы спынілі сваю настаўніцкую дзейнасць.***

— Так, праца настаўнікам па класе акардэона ў жодзінскай дзіцячай школе мастацтваў суправаджалася яркімі і запамінальнымі праектамі. Аднак яшчэ я займаю пасаду кіраўніка Жодзінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму. Таму, вядома, гэта ўсё вымагае шмат сіл і часу. Зараз я займаюся сваімі творчымі праектамі. Разам з мужам Канстанцінам, які цудоўна іграе на саксафоне, мы часта прымаем удзел у гарадскіх святах, таксама наведваем усе буйныя арганізацыі горада. Магчыма, чакаю і новых прапаноў ад патэнцыйных працадаўцаў! (*Смяецца.*)

***— Што прыўнёс Год народнага адзінства ў вашу творчую дзейнасць?***

— Усе мерапрыемствы па-ранейшаму праводзяцца, адзінае, што больш задзейнічаем нашу беларускую сімволіку, арнамент. У нас з'явіліся новыя прыгожыя беларускія касцюмы. Сталі выконваць больш беларускай музыкі, гэта, шчыра, радуе. У музычнай школе, напрыклад, раней ігралі больш праграмных п'ес, было мала музыкі менавіта беларускіх аўтараў. Цяпер жа гэта і «Бульба», і «Лявоніха»... Зараз робіцца больш акцэнт на сваю культуру.

***— Валерыя, як вы лічыце, якую ролю адыгрывае БСЖ для Беларусі? Наколькі гэты саюз важны ў нашай краіне?***

— Саюз жанчын выконвае вельмі важныя функцыі. БСЖ павялічвае статус жанчын у грамадстве, іх ролю ва ўсіх сферах жыцця краіны, дапамагае ў дасягненні грамадзянскага паразумення, міру паміж народамі, ліквідацыі ўсіх формаў гвалту і дыскрымінацыі, спрыяе ахове і паляпшэнню здароўя жанчын, павышэнню якасці іх жыцця, абаранае правы жанчын, дзяцей, займаецца ўмацаваннем сям'і. Усе гэтыя мэты рэалізоўваюцца нашымі, жаночымі, чуйнымі рукамі і сэрцамі, і такім чынам наша краіна рухаецца наперад і робіцца больш камфортнай і ўтульнай для жыхароў. Беларусь — гэта наш агульны агмень, які мы, жанчыны, падтрымліваем, аберагаем і робім лепшай!

**Гутарыла Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з уласнага архіва гераіні.**





# ТАЯМНІЦА ІЗБІЙСКАГА БОРУ



**За дваццаць кіламетраў ад Ганцавіч на лясной паляне стаіць невялічкая капліца. Упоравень з навакольнымі старымі хвоямі падняўся яе прыгожы купал. Ад першай прыступкі да суседніх дрэў — усяго некалькі дзясяткаў крокаў. Даехаць сюды можна дагледжанай асфальтаванай дарогай, але вядзе да царквы і ледзь прыкметная сцежка, якую праходзяць з малітваю, на каленях.**

З якімі надзеямі ідуць сюды людзі, пра што просяць Маці Божую? За ўсіх разам на гэта пытанне адначасова не адкажаш. Звяртаюцца да Багародзіцы, ведаючы, што гэта месца ва ўрочышчы Ізбійскі Бор намоленае стагоддзямі, бо даўным-даўно менавіта тут была знойдзена цудатворная ікона. У той час куды б ні пераносілі мясцовыя вернікі гэту ікону — усё адно вярталася яна да свайго таямнічага ляснога прытулку, каб дапамагаць людзям і даваць надзею.

У наш час, узносячы малітву, заведзена пакідаць на галінках стужкі, хусцінкі, абрусы. Большасць іх завязваюць вакол сухога ствала старой сасны, пад якой у даўніну з'явілася ікона. Часцей за ўсё гэта робяць жанчыны, яны просяць даць ім самае галоўнае багацце — мацярынства. Кажуць, што іх надзеі спраўджваюцца. Пацвярджаюць гэта многія шчаслівыя бацькі, якія вязуць сюды хрысціць сваіх немаўлятак. Абрысы постаці Божай Маці, выяўленай на іконе, захаваліся на спіле аднаго з дрэў, якое расло блізка ад капліцы.

Побач з лясной капліцай бруіць крынічка (кажуць, што яна аднагодка той самай цудатворнай старажытнай іконы). Схаваная пад дахам пабудаванага для яе маленькага доміка, крынічка наталяе кожнага, хто з надзеяй прыходзіць да капліцы Ізбійскага Бору.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

***P. S.*** *Гэтае месца — адно з тых, дзе пабывалі ўдзельнікі сёлетняй міжнароднай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў» з дабратворным Агнём ад Гроба Гасподняга.*







## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОБЪЕКТА

### ОРГАНИЗАТОР: НОВОЛУКОМЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| | |
|---|---|
| **Местоположение земельного участка, его площадь** | **Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, район ул. Коммунальная, 9** |
| **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания объекта «Здание для оказания комплекса ритуальных услуг по адресу: Витебская область, Чашникский район, г. Новолукомль, район ул. Коммунальная, 9» |
| **Кадастровый номер земельного участка** | 225151000001002981 |
| **Площадь, га** | 0,1475 |
| **Срок аренды** | 20 лет |
| **Начальная цена объекта аукциона, руб.** | 4060,68 |
| **Сумма задатка, руб.** | 406,07 |
| **Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.** | 2424,51 |
| **Условия инженерного развития инфраструктуры** | Обеспечить соблюдение санитарных, гигиенических, противопожарных норм и правил, прочих действующих правовых актов Республики Беларусь. Здание разместить с учетом складов и примыкающего проезда ОАО «Витебское молоко». Предусмотреть парковочные места для транспорта посетителей |
